Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

29 ВЕРАСНЯ 2017 г. ПЯТНІЦА №188 (28552)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Усё — аб працоўным праве

СТАР. 4



Брынкуш і Шагал

СТАР. 16



Праграма тэлебачання на тыдзень

20 КАНАЛАЎ

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Валерыя КЛІЦУНОВА, старшыня праўлення Беларускага грамадскага аб'яднання «Адпачынак у вёсцы»:**

*«Доля турызму ў эканоміцы Беларусі імкліва павялічваецца. У краіне функцыянуюць каля 2,3 тыс. аграсядзіб, дзяржава аказвае ім падтрымку. Цяпер ёсць праблема ў стварэнні беларускага цікавага, якаснага турпрадукту. Неабходнасць крэатыўнага падыходу адчулі даўно. Людзі ўжо ведаюць, што такое аграсядзіба, што там можна смачна паесці, падыхаць свежым паветрам. Але важна аказваць і дадатковыя паслугі. Ёсць магчымасці для стварэння гастранамічных маршрутаў, праграм з майстар-класамі рамеснікаў, з удзелам фермерскіх гаспадарак. Тады будуць з'яўляцца новыя і новыя наведвальнікі».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 29.09.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9689 | ▲ |
| Еўра | 2,3143 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0337 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0742 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# ГОЛАС МІРУ

**Кіраўнік дзяржавы сустрэўся з прадстаўнікамі Рады Канферэнцый біскупаў Еўропы**

**У нашай краіне не прынята дзяліць людзей па нацыянальнасці і веравызнанні, па мове і колеры скуры. У апошнія гады такая палітыка стала сапраўднай каштоўнасцю, якая асабліва цэніцца за мяжой. Учора ў сталіцы пачалося пленарнае пасяджэнне Рады канферэнцый біскупаў Еўропы. У Палацы Незалежнасці з высокапастаўленымі ўдзельнікамі мерапрыемства сустрэўся Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.**

## Знак асаблівай павагі

— Прыезд у Мінск такіх высокіх прадстаўнікоў каталіцкага духавенства мы расцэньваем як знак асаблівай павагі да веруючых-католікаў Беларусі. Упэўнены, гэта прызнанне палітыкі міру і згоды, якую наша дзяржава мэтанакіравана праводзіць унутры краіны і на міжнароднай арэне, — прывітаў іерархаў Касцёла кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што сёння Беларусь не проста геаграфічны цэнтр Еўропы. На працягу многіх стагоддзяў у нас гарманічна суседнічаюць розныя рэлігіі. Іх узаемадзеянне ў многім паўплывала на фарміраванне беларускай нацыі, яе культурнае і духоўнае развіццё.

СТАР. 2



Фота БЕЛТА.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА і старшыня Канферэнцыі каталіцкіх біскупаў у Беларусі, Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі арцыбіскуп Тадэвуш КАНДРУСЕВІЧ.

# Ушацкі Паўлюк Багрым

Жыхар гарпасёлка Ушачы Генадзь Карэйша не першы год трымае марку найлепшага каваля раёна. Да яго звяртаюцца і гаспадары прыватных сядзіб, і нават дзяржаўныя ўстановы. Некалі ўшацкаму кавалю прапанавалі аздобіць жалезнымі карункамі тэрыторыю санаторыя «Лясныя азёры». Таксама многія прыхільнікі творчасці гэтага адмысловага майстра ведаюць, што нароўні з цяжкай працай Генадзь аддаецца і паэтычнай музе, як калісьці яго калега Паўлюк Багрым.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Спецыяльны рэпартаж

# ПОШУКІ НЕ ПРЫПЫНЯЦЬ

**У Белавежскай пушчы працягваецца выратавальная аперацыя**




Фота Надзеі БУЖАН.

**У групе «УКантакце» пошукава-выратавальнага атрада «Анёл» людзі працягваюць пакідаць свае тэлефоны і шукаць спадарожнікаў, каб дабрацца да аграгарадка Новы Двор на пошукі дзесяцігадовага Максіма Мархалюка, які сышоў у лес 16 верасня і да гэтага часу не вярнуўся. Акрамя валанцёраў, штодзённа прачэсваюць навакольную тэрыторыю атрады МНС, МУС і Міністэрства абароны. Калі мы туды прыехалі, у пошуках было задзейнічана каля 250 чалавек.**

## Датычыцца кожнага

Такі выпадак — першы на памяці мясцовых жыхароў. У гэтых лясах нават ніколі не губляліся грыбнікі, якія часта заходзяць у гушчар, а месца, дзе знайшлі ровар Максіма, — знаёмае для ўсіх дзяцей аграгарадка. Каля таго шалаша дзеці гулялі не тое, што з году ў год, — на ім будавалі свае «крэпасці» нават іх бацькі. Што павінна было здарыцца, каб дзіця заблукала на такой вядомай тэрыторыі?

Здарэнне не пакінула абыякавым ніводнага жыхара вёскі. Па словах Аліны ВЯРСТАК, з кожнага дома павыходзілі на пошукі хлопчыка. Яна асабіста прачэсвала лес з нядзелі да нядзелі.

СТАР. 3

# ГОЛАС МІРУ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— У адрозненне ад многіх іншых кропак планеты разнастайнасць рэлігій у Беларусі не стала падставай для канфліктаў на нацыянальнай і рэлігійнай глебе, — звярнуў увагу беларускі лідар, — наадварот, служыць умацаванню ўзаемаразумення і павагі. Існуючая ў нас сістэма неканфліктных адносін паміж дзяржавай, рэлігіяй і грамадствам можа і павінна быць прыкладам для іншых краін.

І гэта пры тым, што сёння ў свеце назіраецца вострая патрэбнасць у адкрытым і даверлівым дыялогу. Кіраўнік дзяржавы канстатаваў: няма агульных падыходаў у вырашэнні выклікаў і праблем, якія хвалююць і закранаюць усіх нас.

— Цяперашняя ваша Рада якраз сведчанне таго, што Царква, як заўсёды, паказвае прыклад, якім шляхам трэба ісці, каб хоць бы наблізіцца да рашэння тых цяжкіх, застарэлых канфліктаў, якія ёсць сёння ў свеце. Тым больш важкім становіцца статус нашага Мінска як важнай перамоўнай пляцоўкі, на якой абмяркоўваюцца і прымаюцца рэзалюцыі па самых складаных рэгіянальных і сусветных праблемах. Тое, што вы прыехалі ў Мінск і вырашылі правесці тут Раду — вы паступілі правільна. Мы гэта цэнім.

## Крызіс дабра

Духоўны крызіс, які цяпер перажываюць многія краіны, стаў яшчэ адной тэмай, да якой звярнуўся Аляксандр Лукашэнка падчас сустрэчы з каталіцкім духавенствам.

— Гэта пагроза страшнейшая за любыя эканамічныя выклікі! Ды і ўсе эканамічныя выклікі менавіта ад гэтага. У аснове іх ляжыць бездухоўнасць... Дабро, міласэрнасць, любоў, вера — найвышэйшыя чалавечыя каштоўнасці, якія заўсёды служылі апорай для людзей, разбураюцца на вачах.

Карэннае насельніцтва еўрапейскіх краін старэе, падае нараджальнасць. Гэтыя негатыўныя дэмаграфічныя працэсы адбываюцца на фоне маральнай дэградацыі грамадства, парушэння традыцыйных сямейных інстытутаў і масавага наплыву мігрантаў. У канчатковым выніку ўсё гэта, мяркуе беларускі лідар, можа прывесці да трагічных наступстваў і «выраджэння ўсёй еўрапейскай — найстаражытнейшай, найкаштоўнейшай — цывілізацыі».

— Нельга дапусціць, каб людзі страцілі арыенціры — той унутраны компас, які закладзены ў кожным з нас Госпадам і які дазваляе нам адрозніваць дабро ад зла, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт дзяржавы падкрэсліў: у Беларусі разумеюць важнасць рэлігіі ў жыцці грамадства, у Царквы заўсёды была свая асаблівая роля. Адно са сведчанняў высокага прызнання яе заслуг у нашай краіне — штогадовае ўручэнне прэміі «За духоўнае адраджэнне» святарам, прадстаўнікам рэлігійных арганізацый.

## Без міру не будзе будучыні...

На пленарным пасяджэнні Рады абмяркоўваецца праблема пастырства моладзі, а таксама роля Царквы ў перадаленні крызісаў сучаснай Еўропы. У Беларусь упершыню адначасова прыехала каля 50 вышэйшых каталіцкіх іерархаў Еўропы.

Гаворачы аб праблемах моладзі, Аляксандр Лукашэнка адзначыў:

— Казаць сёння пра моладзь, пра перспектывы маладых людзей, пра іх будучыню без сувязі з тым, наколькі мірным будзе наш кантынент — значыць, як мінімум, дапускаць грубую памылку. Калі не будзе міру ў Еўропе, не будзе і самой моладзі, не будзе ў людзей, якія ідуць за намі, маладосці. Яны як мінімум будуць вымушаны стаяць на полі бою са зброяй у руках і глядзець адзін на аднаго праз прыцэл аўтамата. Гэта недапушчальна.

Аляксандр Лукашэнка канстатаваў: тое, што адбываецца ва Украіне — бяда. Але яшчэ большая бяда ў тым, што мы не можам спыніць вайну.

— Мы не можам даць надзею на будучыню не толькі моладзі гэтай цудоўнай дзяржавы, якой з'яўляецца Украіна, — сказаў кіраўнік Беларусі. — Мы пазбаўляем усялякага жыцця і надзеі сярэдняе і старэйшае пакаленне. Таму гэта страшная бяда, што мы не можам у сваім доме навесці парадак. Гэта кажа пра найцяжэйшы крызіс у Еўропе. Патрэбны вельмі гучны ваш голас і настойлівы заклік да дзяржаўных дзеячаў спыніць вайну і ўмацаваць бяспеку на Еўрапейскім кантыненце, пакуль мы не згубілі Еўропу ўвогуле.

## Стабільнасць патрабуе апоры

Згадаў кіраўнік дзяржавы і выхад Вялікабрытаніі з Еўрасаюза. На думку кіраўніка краіны, гэта «таксама небяспечны інцыдэнт, які можа разбурыць Еўрапейскі саюз». Сустракаючыся на гэтым тыдні з прадстаўніком урада Вялікабрытаніі, Аляксандр Лукашэнка заявіў: наша дзяржава з'яўляецца пабornікам адзінства Еўропы і Еўрасаюза.

— Бо мы прыхільнікі шматпалярнага свету, — растлумачыў беларускі лідар. — А Еўрапейскі саюз з'яўляецца адной з асноўных апор сёння спакою і раўнавагі ў свеце. Калі гэта апора сыходзіць, калі яна будзе парушана, свет нахіліцца — нахіліцца яшчэ больш, зразумела, у які бок.

У многім падтрымаць стабільнасць у грамадстве, у рэгіёне можа ў тым ліку і Царква. Аляксандр Лукашэнка заклікаў удзельнікаў пленарнага пасяджэння Рады Канферэнцый біскупаў Еўропы не адстаяваць ад жыцця. Па яго словах, гэта датычыцца і праваслаўных, і каталіцкіх святароў:

— Каб ні ў якім разе не адстаць ад патрабаванняў жыцця — і своечасова — няхай не праз рэформы, я не вельмі люблю гэта слова, ісці ў кірунку ўдасканалення. Каб людзі ішлі да вас — па параду, па добрае слова, па падтрымку.

Прэзідэнт згадаў адносна нядаўнюю — але ўжо названую гістарычнай — сустрэчу Папы Рымскага і Патрыярха Маскоўскага і ўсяе Русі Кірыла на Кубе ў лютым 2016 года.

— Трэба падумаць пра тое, каб яны сустрэліся тут, у Мінску. Гэта якраз сёння тое месца, дзе можна абмяркоўваць праблемы Захаду і Усходу, Поўдня і Поўначы і ўсёй планеты. Калі вы з Праваслаўнай царквой прыйдзеце да такога разумення, я і беларускі народ зробім усё, для таго каб вы, вашы кіраўнікі, кіраўнікі Праваслаўнай царквы, зрабілі гэту сустрэчу тут, у Мінску, гістарычнай. Падумайце над гэтым, — заклікаў беларускі лідар.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** yushkevich@zviazda.by

## ❍ У тэму

**Кардынал Анджэла БАНЬЯСКА, старшыня Рады Канферэнцый біскупаў Еўропы, архібіскуп Генуэзкі:**

— Рада Канферэнцый біскупаў Еўропы вітае жаданне беларускага боку прыняць у Мінску сустрэчу Папы Рымскага Францыска і Патрыярха Кірыла. Такая паўторная сустрэча вельмі чаканая ўсімі. Мы радуемся жаданню Беларусі правесці яе тут, у Мінску. Мы вельмі пазітыўна ацэньваем Беларусь, яе народ. І асабліва цэнім вялікую ўвагу дзяржавы да інстытута сям'і.

**Архібіскуп Тадэвуш КАНДРУСЕВІЧ, старшыня Канферэнцыі каталіцкіх біскупаў у Беларусі, Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі:**

— У Палацы Незалежнасці праходзяць розныя сустрэчы, але яшчэ ніколі ў ім не было так шмат прадстаўнікоў Каталіцкай царквы. Гэта яшчэ адно сведчанне таго, што кожную гадзіну Беларусь, якая геаграфічна знаходзіцца ў цэнтры Еўропы, усё часцей становіцца цэнтрам прыцягнення бакоў кантынента — не толькі для палітыкаў, эканамістаў, дзеячаў культуры і навукі або спартсменаў, але таксама і для рэлігійных лідараў.

## НА СУВЯЗІ КОЖНЫ ТЫДЗЕНЬ

**Як і раней па суботах, на сувязі з насельніцтвам — Мінскі гарадскі і абласныя выканаўчыя камітэты. Час працы застаецца нязменным — звярнуцца з просьбай або прапановай наўпрост да прадстаўніка ўлады можна з 9 гадзін раніцы і да поўдня.**

30 верасня на званкі будуць адказваць:

кіраўнік спраў БРЭСЦКАГА аблвыканкама Юрый Іосіфавіч НАРКЕВІЧ. Тэл. 8-016 2213121;

намеснік старшыні ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Уладзімір Пятровіч ПЕНІН. Тэл. 8-021 2222222;

намеснік старшыні ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Андрэй Васілевіч КАНЮШКА. Тэл. 8-023 2751237;

намеснік старшыні ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Уладзімір Іосіфавіч ДЗЯШКО. Тэл. 8-015 2735644;

намеснік старшыні МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Дзмітрый Іванавіч ХАРЫТОНЧЫК. Тэл. 8-022 2501869;

першы намеснік старшыні МІНСКАГА аблвыканкама Ігар Мікалаевіч МАКАР. Тэл. 8-017 5004160;

намеснік старшыні МІНСКАГА гарвыканкама Віктар Сяргеевіч ЛАПЦЕЎ. Тэл. 8-017 2224444.

# БЕЗ ПРАВА НА ПАМЫЛКУ

### Прэзідэнт зрабіў шэраг кадравых назначэнняў

**Новых кіраўнікоў атрымалі два міністэрствы — Міністэрства інфармацыі і Міністэрства культуры. Імі сталі адпаведна Аляксандр Карлюкевіч, які раней займаў пасаду намесніка міністра інфармацыі, і Юрый Бондар, які да цяперашняга часу быў рэктарам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Аляксандр Лукашэнка назначыў таксама двух памочнікаў Прэзідэнта — па Мінскай і Віцебскай абласцях. Акрамя гэтага, шэраг універсітэтаў атрымалі новых рэктараў.**

Падчас назначэння новага кіраўніка Міністэрства інфармацыі, Прэзідэнт падкрэсліў:

— Права на памылку ў вас няма. Горш працаваць у Міністэрстве інфармацыі мы не павінны. Калі там ёсць нейкія недахопы, гэта і ваша віна: вы не простым чалавекам там былі, а працавалі намеснікам.

Аляксандр Лукашэнка дадаў, што вопыт і веды папярэдняга кіраўніка ведамства Лідзіі Ананіч будуць запатрабаванымі ў іншай сферы.

— Мы не можам ёй прад'явіць нейкія надзвычайныя прэтэнзіі і адхіліць ад пасады. Мы павінны дакладна разумець, што яна будзе працаваць на іншым участку. Вы мне потым даложыце, куды прапануеце яе працаўладкаваць, — даручыў Аляксандр Лукашэнка кіраўніку Адміністрацыі Прэзідэнта Наталлі Качанавай.

Назначаючы новым міністрам культуры Юрыя Бондара, кіраўнік дзяржавы заўважыў, што ў гэтым ведамстве заўсёды складваецца няпростая абстаноўка, бо ў ім працуюць творчыя людзі.

— Там заўсёды шмат розных плётак, абгавораў, разважанняў — такое жыццё, — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка. — Тым не менш мы павінны працаваць такім чынам, каб гэтых размоў было менш, а людзі былі нацэлены на канкрэтную работу. Трэба паставіць сябе такім чынам, каб усё было сумленна і справядліва, кожны займаўся сваёй справай, а не хадзіў і плакаўся, як яму цяжка, або скардзіўся на калегу.

Ігар Яўсееў прызначаны памочнікам Прэзідэнта — інспектарам па Мінскай вобласці, дагэтуль працаваў начальнікам упраўлення ўнутраных спраў Мінскага аблвыканкама. Аляксандр Субоцін, што займаў пасаду намесніка міністра сельскай гаспадаркі і харчавання — дырэктара Дэпартамента ветэрынарнага і харчовага нагляду, стаў памочнікам Прэзідэнта — інспектарам па Віцебскай вобласці.

— Накіраваць ваеннага чалавека памочнікам — такое ў мяне было жаданне даўно, — сказаў кіраўнік краіны, гаворачы пра прызначэнне Ігара Яўсеева. — Гэта добры будзе эксперымент, хоць наўрад ці эксперымент. Чалавек, які пачынаў працаваць на зямлі, які, тым больш, працуючы на вялікіх пасадах, даслужыўся да генеральскіх пагонаў, пры тым, які ведае людзей, разбіраецца ў сітуацыі, — я думаю, тут памылкі не будзе. Паглядзім, як складзецца лёс генерала на гэтай грамадзянскай пасадзе, хоць цяжка сказаць, што яна грамадзянская: яна часам больш важная і яшчэ больш ваенная, чым у некаторых людзей з пагонамі.

Звяртаючыся да Аляксандра Субоціна, Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на сістэму сельскай гаспадаркі ў Віцебскай вобласці:

— Вы ведаеце сельскую гаспадарку. Прытым ведаеце не толькі з пункту гледжання «нізоў», вы вучоны чалавек. Там работы вельмі шмат, і перш за ўсё нам трэба раз і назаўсёды рассекчы гэты «гордзіеў вузел» са структурай пасеваў: мы да гэтага часу не можам там убраць пару тысяч гектараў збожжавых. Якія гэта ўжо збожжавыя ў кастрычніку, вы добра разумееце. Значыць, трэба сеяць там, дзе магчыма.

Кіраўнік краіны назначыў новага рэктара Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта — ім стаў Андрэй Кароль, які дагэтуль узначальваў Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы. Акрамя гэтага, Аляксандр Лукашэнка ўзгадніў прызначэнне Сяргея Харытончыка рэктарам Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта, Дзяніса Дука — рэктарам Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. А. Куляшова, Максіма Кіркора — рэктарам Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта харчавання.

— Студэнты — вальнадумцы, — сказаў Прэзідэнт. — Мы самі такія былі. Не ведаю, як вы, а я — дакладна. Таму не трэба ў іх гэтую жылку і струнку душыць. Але іх трэба выхоўваць патрыётамі нашай краіны, каб не атрымалася так, што мы трацім тут грошы на іх выхаванне, а заўтра яны завярнуліся, працуюць невядома дзе і толку ад гэтага краіне няма.

Кіраўнік дзяржавы таксама падкрэсліў асаблівую ролю рэктараў ВНУ і значнасць гэтай пасады:

— Як толькі вы выйдзеце за парог гэтага кабінета, вы — людзі Прэзідэнта. Вы ажыццяўляеце яго палітыку. У адваротным выпадку не трэба згаджацца і ісці на гэтыя пасады. Маю палітыку вы ведаеце: калі я нешта буду казаць не так і не буду мець рацыю, вы мне скажыце адразу. Рашэнне прынята, прамаўчалі — выконвайце. Гэта датычыцца ўсіх. Што датычыцца рэктараў — гэта асаблівыя людзі. Гэта людзі, якія куюць будучыню, эліту нашай краіны.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** yushkevich@zviazda.by

## КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч



Нарадзіўся 6 студзеня 1964 года ў вёсцы Зацітава Слабада Пухавіцкага раёна. У 1985 годзе скончыў Львоўскае вышэйшае ваенна-палітычнае вучылішча; у 2002 годзе — Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. З'яўляецца лаўрэатам прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне».

З 1985 года працаваў на розных пасадах у рэдакцыях сродкаў масавай інфармацыі, у тым ліку ў такіх выданнях, як газета «За Родину» ў Ашхабадзе, газеты «Ленинец», «Во славу Родины», «Культура», «Звязда», «Чырвоная змена», «Народная газета», «Советская Белоруссия» ў Мінску.

У 2006—2011 гадах — дырэктар рэдакцыйна-выдавецкай установы «Літаратура і мастацтва».

У 2011—2012 гадах — галоўны рэдактар установы «Рэдакцыя газеты «Звязда».

У 2012—2016 гадах — дырэктар — галоўны рэдактар рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда».

З 2016 года да гэтага часу працаваў на пасадзе намесніка міністра інфармацыі.

## БОНДАР Юрый Паўлавіч



Нарадзіўся 11 красавіка 1973 года ў Мінску. Скончыў у 1997 годзе юрыдычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта па спецыяльнасці «правазнаўства», у 2007 годзе — Інстытут дзяржаўнай службы Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь па спецыяльнасці «дзяржаўнае кіраванне сацыяльнай сферай».

У 2006 годзе абараніў дысертацыю на саісканне вучонай ступені кандыдата палітычных навук па спецыяльнасці «тэорыя палітыкі, гісторыя і метадалогія палітычнай навукі» ў Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. У 2009 годзе Юрыю Бондару прысвоена вучонае званне дацэнта па спецыяльнасці «паліталогія».

У Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў — з 2001 года, працаваў на пасадах выкладчыка, старшага выкладчыка, дацэнта кафедры культуралогіі, першага прарэктара. У лютым 2013 года быў назначаны на пасаду рэктара гэтай ВНУ.

У 2014 годзе быў выбраны дэпутатам па Чыгуначнай выбарчай акрузе Мінска, намеснікам старшыні Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў XVII склікання.

Юрый Бондар з'яўляецца аўтарам шматлікіх артыкулаў, дакладаў, навуковых публікацый, вучэбна-метадычных комплексаў.

# ПОШУКІ НЕ ПРЫПЫНЯЦЬ


Аліна Вярстак.

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

Разам са знаёмай па крокамеры яны налічылі, што праходзілі ў дзень да 30 кіламетраў, але ніякага следу... Пушча вельмі густая, у некаторых мясцінах прыйшлося нават прапаўзаць. Далёка не бачна — усюды дрэвы. Нечакана яны наткнуліся на зубраня. Добра, што побач не было яго маці. Выходзілі каля 11, вярталіся бліжэй да гадзіны ночы. Потым ужо сталі прыходзіць раней, бо падключыліся спецыялісты з цеплавізарамі, якія маніторылі тэрыторыю ноччу. У пошуках удзельнічаў і муж Аліны, яе дачка спецыяльна прыехала з Мінска. Яна сябруе са старэйшым братам Максіма. А Аліна працуе разам з бацькам хлопчыка, гаворыць, што найдабрэйшы, безадмоўны чалавек. Ды, увогуле, мясцовыя жыхары станоўча характарызуюць гэту сям'ю.

— Лічу, што нельга застацца абыякавым да гэтай бяды, — расказвае Аліна. — Тут паднялася ўся вёска. Я даведалася пра здарэнне ў нядзелю, аказалася, ужо нават ноччу ў суботу ездзілі яго шукаць. Адразу выйшла на пошукі ўся Лясная вуліца, дзе жыве сям'я Максіма. Шмат было моладзі на машынах і матацыклах.

Дапамагалі не толькі ў лесе. Калі на выхадныя прыехала больш за 2000 людзей на пошукі, Аліна з мужам адкрылі вароты, каб можна было ў двары паставіць машыны. І паклікалі на начлег восем валанцёраў з іншых гарадоў, апошнія з'ехалі толькі ў сераду і планавалі вярнуцца ў выхадныя, калі сітуацыя не зменіцца. Гавораць, калі людзі ў суботу сталі ў шарэнгу прачэсваць лес, яна расцягнулася амаль да суседняй вёскі Корнадзь.

Валанцёры дапамагаюць таксама тым, што гатуюць, прывозяць неабходныя рэчы. Адзін мужчына, па расказах мясцовых жыхароў, самастойна прывёз цэлы бартавы УАЗік прадуктаў.

### Глядзіце ўважліва!

**Начальнік Свіслацкага раённага аддзела ўнутраных спраў Валерый РАМАНЧУК** расказвае, што зараз пошукавыя мерапрыемствы паглыбляюцца. У сераду, 27 верасня, шчыльнымі групамі прачэсвалі балоты метр за метрам. Ад таго месца, дзе сведкі бачылі хлопца ўвечары ў суботу, 16 верасня, — каля шлагбаума на ўездзе ў запаведнік, — у паўночным напрамку ўжо ўсё праверана, групы адпрацоўваюць квадраты на паўднёвым захадзе.

Мы далучыліся да атрада з супрацоўнікаў міліцыі, які пачаў рухацца з сярэдзіны лесу да балот. Маладыя людзі становіцца на адлегласці каля трох метраў адзін ад аднаго. Па баках і ў сярэдзіне стаяць галаўныя групы, якія сочаць, каб шарэнга не збівалася і не расцягвалася, каб ніхто не адстаў. Час ад часу перакрыкваюцца і раўняюцца. Ужо дзесьці праз сто метраў другому боку стала ісці цяжэй: пасярэдзіне шарэнгі пачалі па калена вязнуць у вадзе. А вакол яшчэ лес: балота нават не пачыналася. Увогуле ўсе характарызуюць мясцовасць як вельмі складаную, акрамя іншага, там яшчэ і завалы. Багністыя мясціны цяжка праходзіць. У дзень можа атрымацца толькі 10—15 кіламетраў.

Валерый Раманчук расказвае, што ў асноўным у лесе губляюцца грыбнікі. Часам іх знаходзяць і за 20—30 кіламетраў ад хаты. Людзі дэзарыентуюцца, далей паніка. Пачынаюць бегаць і часам выходзяць да балота. Але, вядома, каб выйсці да людзей, неабходна трымацца лясных дарог. Яны абавязкова кудысьці выведуць.

### Працяг будзе

Усяго ў аграгарадку пражывае 740 чалавек.




Фота Надзеі БУЖАН.

**Старшыня Навадворскага сельвыканкама Свіслацкага раёна Уладзімір ЗДАНОВІЧ** працуе на гэтай пасадзе ўжо 11 гадоў, таму і ведае асабіста амаль кожнага. Ён таксама ўсе гэтыя дні ўдзельнічае ў пошуках. Разам з ім хадзіў і бацька хлопчыка. За гэты час тут працавалі і верталёты, і спецтэхніка. Такое ўпершыню здарылася ў тутэйшых мясцінах.

У распрацоўцы застаецца некалькі версій. Адна з асноўных — хлопчык у змроку заблукаў у лесе, таму ёсць сэнс працягваць яго шукаць. Гавораць, што ў той дзень недалёка ад Новага Двара прайшоў статак зуброў, які мог напалохаць Максіма. Акрамя таго, ёсць меркаванні, што хлопчык мог спецыяльна сысці з дому, але пакуль пацвердзіць яе немагчыма.

Валанцёр Раман Хартон з Мінска адпрацаваў некалькі дзён на мінулым тыдні і вярнуўся зноў на гэтым. У Новым Двары да гэтай пары чакаюць добраахвотнікаў і будуць шукаць Максіма, пакуль не знойдуць.

**Надзея АНІСОВІЧ.** *anisovich@zviazda.by*

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Расія створыць электрамагнітную бомбу

У Расіі распрацоўваюцца радыёэлектронныя боепрыпасы, прызначаныя для нанясення ўрону тэхніцы праціўніка за кошт магутнага ЗВЧ-імпульсу, паведаміў РІА Навіны саветнік першага намесніка гендырэктара канцэрна «Радыёэлектронныя тэхналогіі» Уладзімір Міхееў. Паводле яго слоў, інтэнсіўнасць уздзеяння перспектыўнай зброі вар'іруецца ў залежнасці ад задач. Міхееў адзначыў, што работа над радыёэлектроннымі боепрыпасамі вядзецца з найвышэйшым грыфам сакрэтнасці. «Сёння мы можам толькі сказаць, што ўсе гэтыя напрацоўкі пераведзены ў плоскасць канкрэтных доследна-канструктарскіх работ па стварэнні электрамагнітнай зброі», — сказаў саветнік.

### Прэзідэнт Мексікі ацаніў выдаткі на аднаўленне пасля землятрусу



Прэзідэнт Мексікі Энрыке Пенья Ньета заявіў, што на аднаўленне разбурэнняў ад двух верасnеўскіх землятрусаў спатрэбіцца каля 37,5 мільярда песа (больш за два мільярды долараў). Паводле яго слоў, толькі штатам Ч'япас і Аахака будуць выдзелены 6,5 мільярда песа (358,5 мільёна долараў), астатнім штатам, уключна з горадам Мехіка, будуць накіраваны 10 мільярдаў песа (551,5 мільёна долараў). Як вядома, землятрус магнітудай 7,1 адбыўся ў Мексіцы 19 верасня. Магутныя падземныя штуршкі на поўдні краіны дайшлі і да Мехіка, дзе разбураны дзясяткі дамоў. Пасля паведамлялася яшчэ аб двух паўторных ударах падземнай стыхіі магнітудай 5,8 і 6,1. Па апошніх афіцыйных звестках, загінулі 337 чалавек. Яшчэ адзін моцны землятрус адбыўся 7 верасня, тады загінула каля 70 чалавек.

### Шведскія навукоўцы прыдумалі, як перапрацаваць пер'е ў харчовы прадукт



Альтэрнатыўнай крыніцай бялку могуць стаць адходы з птушкафабрык, лічаць шведскія навукоўцы. З дапамогай бактэрый ім удалося разабраць бялок, што змяшчаецца ў пер'ях, на амінакіслоты, якія можна выкарыстаць пры падрыхтоўцы корму для жывёл і нават дадаваць у ежу для людзей. Штогод утылізуюцца тоны пер'я з птушкафабрык. Аднак дзякуючы бялку, які змяшчаецца ў іх, яны могуць стаць каштоўным прадуктам харчавання, лічаць біятэхнолагі з Лундскага ўніверсітэта ў Швецыі. Плюс такога падыходу ў тым, што не патрабуецца выкарыстоўваць хімікаты, што станоўча адаб'ецца як на навакольным асяроддзі, так і на коште прадукту. З кілаграма пёраў можна атрымаць да 900 грамаў бялку.

## Парламенцкі дзённік

# Бюджэт, Мытны кодэкс, выстаўка АСЕАН

### Перад пачаткам чарговай сесіі дэпутаты вызначыліся з кірункамі работы

**У панядзелак, 2 кастрычніка, пачне работу трэцяя сесія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі. Напярэдадні гэтай падзеі дэпутаты падвялі вынікі работы за міжсесійны перыяд і вызначыліся з асноўнымі кірункамі будучай работы.**

На цяперашні момант у пастаянных камісіях знаходзіцца 58 законапраектаў, амаль палова з іх ужо падрыхтавана і будзе ўключана ў парадак дня сесіі, заявіў падчас пасяджэння Савета Палаты прадстаўнікоў яе **спікер Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА**. Што датычыцца работы над пакетам бюджэтных дакументаў, многія дэпутаты пастаянных камісій з вясны ўключыліся ў яе і ўнеслі ўжо свае прапановы, некаторыя з якіх былі ўлічаны падчас дапрацоўкі Саветам Міністраў. «Гэта, у прыватнасці, датычыцца размеркавання сродкаў дарожнага фонду. Фінансаванне павінна накіроўвацца не толькі на бягучы рамонт мясцовых аўтамабільных дарог, але і вуліц, якія з'яўляюцца іх працягам», — прывёў прыклад старшыня Палаты прадстаўнікоў. Уладзімір Андрэйчанка таксама заклікаў дэпутатаў паскорыць работу над законапраектамі эканамічнага блока: процідзеянне манапалістычнай дзейнасці, дзяржаўна-прыватнае партнёрства, дзяржаўныя закупкі, удасканаленне банкаўскага заканадаўства.

Спікер падняў і пытанне правядзення сёлета парламенцкіх слуханняў. «Галоўным вынікам слуханняў павінны быць выразныя рэкамендацыі па ўдасканаленні прававой базы і практыкі яе прымянення», — удакладніў ён.

Па словах **Леаніда Цупрыка, старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце**, плануецца, што законапраект па ратыфікацыі дамовы аб Мытным кодэксе Еўразійскага эканамічнага саюза будзе прадстаўлены ў парламент для разгляду ўжо падчас надыходзячай сесіі. Новы кодэкс уступіць у сілу пасля таго, як усе пяць краін удзельніц — Беларусь, Расія, Арменія, Кыргызстан, Казахстан — ратыфікуюць дакумент.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

## Надвор'е

# ПАДМАРОЗІЦЬ УНАЧЫ

**Халоднае надвор'е чакаецца ў наступныя пяць дзён, паведамляюць у Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

У суботу будзе пераважна без ападкаў. Тэмпература паветра ўначы складзе 1—7 цяпла, але на глебе і месцамі ў паветры чакаюцца замаразкі ад 0 да мінус 3 градусаў. Тэмпература паветра ў другой палове дня дасягне ад плюс 8 да плюс 13 градусаў, а па паўднёвым захадзе паветра прагрэецца да 15 цяпла. У нядзелю чакаецца воблачнае з праясненнямі надвор'е, у асобных раёнах магчымы невялікі дождж. Уначы і раніцай будзе слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе 1—8 цяпла, месцамі замаразкі да мінус 3 градусаў. Удзень тэмпература паветра будзе дасягаць 8—13 цяпла, а па паўднёвым захадзе — да плюс 16 градусаў.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у першы дзень наступнага тыдня ў нас яшчэ захавае ўплыў вобласці павышанага атмасфернага ціску. Таму будзе без істотных ападкаў. Удзень у заходніх раёнах краіны прагназуецца парывісты вецер. Уначы і раніцай магчымы слабы туман. Мінімальная тэмпература паветра ўначы будзе 1—7 цяпла, на глебе і месцамі ў паветры замаразкі да мінус 3 градусаў. Удзень прагназуецца да плюс 10 да плюс 15 градусаў, па паўднёвым захадзе — да 17 цяпла.

Спецыялісты падлічылі, што ў аўторак тэрыторыя нашай краіны апынецца пад уплывам атмасферных франтоў атлантычнага цыклону. Надвор'е пачне мяняцца. Уначы і днём у заходніх раёнах Беларусі пройдуць дажджы, месцамі чакаецца парывісты вецер. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 3 па ўсходзе да плюс 10 градусаў па захадзе краіны. Удзень чакаецца 8—13 цяпла, а на поўдні — да 15 цяпла. Чакаецца, што і ў сераду ў нас будуць частыя дажджы.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

## Цэны

# Наш бензін таннейшы за расійскі

**Аб тым, што пара павысіць цану на аўтамабільнае паліва, паведаміў намеснік генеральнага дырэктара «Беларуснафты» Сяргей КАМОРНІКАЎ падчас V Міжнароднай галіновай канферэнцыі.**

Ён у прыватнасці адзначыў, што рост цэн на нафту назіраецца на працягу апошніх месяцаў. «Сёння цана барэля нафты на сусветных пляцоўках перавысіла 55 долараў, а на гэтым тыдні нават дасягала 59 долараў. Цэны растуць і ў суседніх краінах. Цяпер у Беларусі бензін каштуе танней, чым у Расіі, якая здабывае ў шмат разоў больш нафты. Кан'юнктура рынку падштурхоўвае да таго, што цэны на аўтамабільнае паліва ў Беларусі могуць павысіцца», — сказаў Сяргей Каморнікаў. Намеснік гендырэктара выказаў меркаванне, што мэтазгодным з'яўляецца рост цэн на паліва на 5%.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

# А ШТО КАЖА ПРАЦОЎНАЕ ПРАВА?

## Заканадаўства ахоўвае права работніка на адпачынак, нават калі ён не жадае гэтым правам скарыстацца

**У рэдакцыі «Звязды» прайшла прамая лінія, прысвечаная «пенсійным пытанням». Чытачы газеты мелі магчымасць задаць пытанні юрыстам — гасцям рэдакцыі: галоўнаму прававому інспектару працы Цэнтральнага камітэта прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Ларысе Васілеўне МАНЮК і галоўнаму прававому інспектару працы Рэспубліканскага камітэта Беларускага прафсаюза работнікаў аграпрамысловага комплексу Сафіі Васілеўне ГРЫШУЦІНАЙ.**

*— Добры дзень! Вас турбуе Ільюшонак Віктар Дзмітрыевіч з вёскі Вяляцічы Барысаўскага раёна. У мяне такая сітуацыя: 1 жніўня мне споўнілася 60 гадоў. Я працую, дакладней, працаваў лесніком у Барысаўскім лягасе. Са мной быў працягнуты кантракт да 1 жніўня 2018 года. І вось пасля гэтага на працягу месяца мне на рабоце робяць чатыры вымовы і 11 верасня звальняюць па арт. 42, п. 4 — за сістэматычнае невыкананне службовых абавязкаў. Я працаваў лясніком з 1994 года. Пры старым кіраўніцтве неаднаразова ўзнагароджваўся. І вось тут такое... Скажыце, ці магу я аднавіцца на працы? На пенсію ісці толькі праз год...*



**Сафія ГРЫШУЦІНА:**

— Неабходна высветліць, ці правільна наймальнік прыцягнуў вас да дысцыплінарнай адказнасці. Заканадаўствам прадугледжана, што да прымянення дысцыплінарнага спагнання наймальнік абавязаны запатрабаваць ад вас пісьмовае тлумачэнне і аформіць дысцыплінарнае спагнанне загадам або распараджэннем, якое абвяшчаецца работніку пад роспіс у пяцідзённы тэрмін, не лічачы часу хваробы работніка ці знаходжання яго ў адпачынку. Калі ў названы тэрмін вас не азнаёмілі з загадам аб дысцыплінарным спагнанні, то лічыцца, што вы не маеце спагнання.

Яшчэ адзін важны момант: дысцыплінарнае спагнанне прымяняецца не пазней чым за адзін месяц з дня выяўлення правіннасці, не лічачы часу хваробы або водпуску работніка.

Далей, згодна з арт. 46 Працоўнага кодэкса, наймальнік павінен быў папярэдзіць прафсаюз не пазней чым за два тыдні да звальнення або атрымаць згоду прафсаюза на ваша звальненне, калі пра гэта запісана ў калектыўным дагаворы вашай арганізацыі.

Згодна з арт. 242 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, па справах аб звальненні работнікі могуць звярнуцца ў суд у месячны тэрмін з дня ўручэння копіі загада аб звальненні або з дня выдачы працоўнай кніжкі з запісам аб падставе спынення працоўнага дагавора, або з дня адмовы ў выдачы або атрыманні названых дакументаў .

Для аказання бясплатнай юрыдычнай дапамогі па звароце ў суд рэкамендую вам, Віктар Дзмітрыевіч, звярнуцца ў Рэспубліканскі камітэт работнікаў лесу.

***

*— Гэта Аляксандр з Мінска вам тэлефануе. Калі можна, хацеў бы ананімна задаць пытанне. Я працую ў немаленькай арганізацыі вартаўніком. У нас пагадзінная аплата працы. На гэты момант, я маю на ўвазе апошні месяц, мы працуем два вартаўнікі на аб'екце — суткі праз суткі. Гэта атрымліваецца 15 дзён у месяц — па 24 гадзіны. Усяго атрымліваецца 360 гадзін. Скажыце, калі ласка, ці ёсць у нас перапрацоўка?*

**Сафія ГРЫШУЦІНА:**

— Пералік катэгорый работнікаў, для якіх можа ўстанаўлівацца працягласць змены звыш 12 гадзін, але не больш за 24 гадзіны, устаноўлены пастановай Савета Міністраў ад 25.01.2008 года №104 «Аб працягласці змены звыш 12 гадзін для асобных катэгорый работнікаў». Гэта пастанова прадугледжвае магчымасць устанаўлення змены больш за 12 гадзін для рабочых, якія забяспечваюць пажарную бяспеку або ахову аб'екта. Паколькі выкананне названых абавязкаў уключана ў характарыстыку работ, што выконваюцца вартаўніком, працягласць яго працоўнай змены можа складаць больш за 12 гадзін.

Пры арганізацыі працы вартаўнікоў у зменным рэжыме захаваць устаноўленую арт.112—114 Працоўнага кодэкса штодзённую або штотыднёвую працягласць працоўнага часу вельмі цяжка. Таму наймальніку неабходна ўжываць падсумаваны ўлік працоўнага часу для вартаўнікоў. Працягласць уліковага перыяду наймальнік мае права ўстанавіць самастойна па ўзгадненні з прафсаюзам. У гэтай частцы парушэнняў з боку наймальніка не бачыцца.

Улічваючы ананімнасць звароту, рэкамендую звярнуцца ў прафсаюз сваёй галіны для канкрэтызацыі пытанняў па вашай сітуацыі.

***

*— Скажыце, калі мой працоўны год пачаўся ў жніўні (працую настаўнікам), а ў пачатку сакавіка планую пайсці ў дэкрэтны водпуск, ці маю я права перад дэкрэтам узяць чарговы працоўны водпуск за ўвесь працоўны год? Ці толькі за адпрацаваны перыяд? (пытанне прыйшло па электроннай пошце).*



**Ларыса МАНЮК:**

— У адпаведнасці з ч. 5 п. 5 арт. 168 Працоўнага кодэкса пры складанні графіка працоўных водпускаў наймальнік абавязаны запланаваць водпуск па жаданні работніка ў пэўны перыяд — жанчынам перад водпускам па цяжарнасці і родах або пасля яго. У адпаведнасці з ч. 2 п. 1 арт. 166 ПК першы працоўны водпуск наймальнік абавязаны прадаставіць да заканчэння шасці месяцаў працы па жаданні работніка — жанчынам перад водпускам па цяжарнасці і родах або пасля яго. У выпадку прадастаўлення гэтай катэгорыі работнікаў працоўнага водпуску за першы год работы або за наступныя гады водпуск прадастаўляецца ў поўным аб'ёме незалежна ад адпрацаванага перыяду.

***

*— Добры дзень! Мяне завуць Таццяна Дзмітрыеўна Новікава, тэлефаную з Чачэрскага раёна Гомельскай вобласці. Я працую па кантракце тэрмінам на адзін год у прыватнай арганізацыі. Атрымала паведамленне, што кантракт са мной прадаўжацца больш не будзе. За тры дні да звальнення захварэла і знаходзілася на бальнічным лісце 21 дзень. Чула, што нельга звальняць работніка, калі ён хварэе, а калі можна, то за колькі дзён хваробы мне аплацяць бальнічны ліст?*

**Сафія ГРЫШУЦІНА:**

— Працоўным кодэксам прадугледжана, што не дапускаецца звальненне работніка па ініцыятыве наймальніка ў перыяд часовай непрацаздольнасці. Аднак заканчэнне тэрміну дзеяння кантракта не з'яўляецца звальненнем па ініцыятыве наймальніка, таму работнік, які працуе па кантракце, можа быць звольнены ў сувязі са сканчэннем тэрміну кантракта ў перыяд часовай непрацаздольнасці.

Што датычыцца другой часткі вашага пытання, то згодна з Палажэннем аб парадку забеспячэння дапамогамі па часовай непрацаздольнасці і па цяжарнасці і родах, зацверджаным пастановай Савета Міністраў ад 28.06.2013 года №569, у выпадку спынення работы ў перыяд часовай непрацаздольнасці, дапамога прызначаецца і выплачваецца за ўвесь перыяд часовай непрацаздольнасці, у тым ліку за дні непрацаздольнасці пасля спынення працоўнага дагавора.

Таму дапамога па часовай непрацаздольнасці вам будзе налічана і выплачана за ўвесь перыяд часовай непрацаздольнасці.

***

*— Добры дзень! Мяне завуць Валерыя Сцяпанаўна Русакевіч, працую настаўніцай гісторыі ў сельскай школе. Зараз у дэкрэтным водпуску. З'явілася інфармацыя, што з новага навучальнага года нашу школу плануецца закрыць. Я ў гэты час яшчэ буду ў дэкрэтным водпуску. Падкажыце, мяне звольняць? Калі так, то, на якія выплаты я магу прэтэндаваць?*

**Ларыса МАНЮК:**

— Паважаная Валерыя Сцяпанаўна, у выпадку ліквідацыі школы, калі яна з'яўляецца юрыдычнай асобай, то пасля выхаду з сацыяльнага водпуску па доглядзе дзіцяці да дасягнення ім узросту трох гадоў, вы будзеце падлягаць звальненню па п. 1 арт. 42 ПК (ліквідацыя арганізацыі). Пры звальненні ў сувязі з ліквідацыяй арганізацыі вы атрымаеце ўсе выплаты, якія прадугледжаны заканадаўствам аб працы. Афармленне звальнення і выплаты будуць ажыццёўлены аддзелам адукацыі. Калі будзе прынята рашэнне аб ліквідацыі школы, і вы перапыніце сацыяльны водпуск і выйдзеце на працу, то гэтыя выплаты вы атрымаеце адразу.

***

*— Надзея Пятроўна, работніца хлебазавода з Гомеля. Я працую цестамесам на хлебазаводзе па графіку зменнасці. Ці абавязаны наймальнік прадастаўляць мне абедзенны перапынак і якой працягласці? Ці будзе ён уключацца ў працоўны час? І яшчэ адно пытанне: ці магу я адмовіцца ад абеду?*

**Сафія ГРЫШУЦІНА:**

— Надзея Пятроўна, заканадаўства ахоўвае права работніка на адпачынак, нават калі ён не жадае такім правам скарыстацца. Гэта звязана з тым, што адсутнасць перапынку для харчавання і адпачынку можа негатыўна адбіцца на прадукцыйнасці і якасці працы, нанесці шкоду здароўю работніка, а таксама парушыць ахову працы, што недапушчальна. Наймальнік з улікам характару вытворчасці абавязаны абсталяваць санітарна-бытавыя памяшканні, у тым ліку памяшканні для прыёму ежы (сталовыя).

Абедзенны перапынак павінен быць ва ўсіх арганізацыях і абсалютна ва ўсіх работнікаў незалежна ад іх пасады і прафесіі. Яго можна замацаваць у правілах унутранага працоўнага распарадку, графіку работ (зменнасці), працоўным дагаворы (кантракце), па дамове паміж работнікам і наймальнікам.

Згодна з заканадаўствам, перапынак для адпачынку і харчавання павінен быць не менш за 20 хвілін і не больш за дзве гадзіны. У гэтых межах можна ўстанавіць любую яго працягласць, але ён павінен быць, а значыць, трэба прадаставіць работніку хоць бы мінімальны абед у 20 хвілін.

У некаторых арганізацыях умовы вытворчасці не дазваляюць устанавіць работнікам паўнавартасны перапынак для адпачынку і харчавання, напрыклад, на такіх бесперапынных вытворчасцях як хлебазаводы, работнікі якіх не могуць адлучацца з працоўнага месца, каб прыняць ежу ў сталовай.

У гэтых выпадках работніку трэба даць магчымасць прымаць ежу падчас работы. Пералік такіх работ, парадак і месца прыёму ежы наймальнік устанаўлівае самастойна. Пры гэтым час, неабходны для прыёму ежы, у адрозненне ад абедзеннага перапынку, уключаецца ў працоўны час і аплачваецца.

— Дзякуй!

*(Працяг прамой лініі чытайце ў наступных нумарах «Звязды».)*

**Святлана БУСЬКО.** *busko@zviazda.by*

# І НАВАТ ГІБРЫДНАЯ КАРДЫЯХІРУРГІЯ

## Колькасць кардыялагічных хворых будзе расці, нягледзячы на магчымасці сучаснай медыцыны

**Насельніцтва краіны няўхільна старэе, акрамя таго, у нас шырока распаўсюджаны фактары рызыкі — злоўжыванне алкаголем, нікацінавая залежнасць, няправільнае харчаванне і нізкая фізічная актыўнасць, што аб'ектыўна абумоўлівае высокія лічбы сардэчна-сасудзістай захваральнасці. Дастаткова сказаць, што амаль кожны трэці дарослы мае артэрыяльную гіпертэнзію. А яшчэ ішэмічная хвароба сэрца, цэрэбраваскулярныя захворванні... Нездарма сардэчна-сасудзістая паталогія традыцыйна займае адно з вядучых месцаў у структуры смяротнасці.**



Рэалізацыя некалькіх дзяржаўных праграм па барацьбе з шырокай распаўсюджанасцю захворванняў сістэмы кровазвароту дапамагла ў мінулыя гады паўплываць на зачэпную гібель, знізіць смяротнасць. Поспехі сталі магчымыя дзякуючы зладжанай рабоце пярвічнага звяна, для якога сёлета былі распрацаваны новыя алгарытмы лячэння, і такім чынам узрасла значнасць вядзення пацыентаў на ўзроўні ўчастковых урачоў і ўрачоў агульнай практыкі. Робіцца акцэнт і на тым, каб павялічыць паўнамоцтвы медсясцёр і памочнікаў урача, паведамляе дырэктар РНПЦ «Кардыялогія» акадэмік НАН Беларусі Аляксандр МРОЧАК.

Калі ёсць фактары рызыкі, але яшчэ няма клінічных праяў — гэта адно лячэнне, калі размова ідзе аб прафілактыцы інсульту, патрабна гіпатэнзіўная тэрапія, звязаная з кантролем артэрыяльнага ціску, а калі ўжо развілася ішэмічная хвароба сэрца, размова ідзе аб інтэрвенцыйным лячэнні або адкрытай аперацыі на сэрцы. Дарэчы, кардыяхірургія развіваецца неверагодна імкліва, амаль штогод з'яўляюцца новыя магчымасці для праўядзення хірургічнага ўмяшання. Прымяняюцца ўжо і ствалавыя клеткі, распаўсюджаны час укараніць гібрыдную хірургію — цяпер праектуецца новы аперацыйны блок для сумеснай работы кардыяхірурга і рэнтгенэндаваскулярнага хірурга.

Развіццё інтэрвенцыйнай кардыялогіі (часткі рэнтгенэндаваскулярнай хірургіі) дазволіла з дапамогай дыягнастычных і аперацыйных умяшанняў знізіць за 7 гадоў смяротнасць ад вострага інфаркту міякарда на 40 працэнтаў. З 2010 года ўсё часцей інтэрвенцыйныя тэхналогіі прымяняюцца ў выпадках вострага інфаркту: калі ў 2010-м усяго 2 працэнты хворых атрымалі менавіта такое лячэнне, то цяпер гэта ўжо 35 працэнтаў. Тэхналогіі атрымалі развіццё не толькі ў абласцях, але і ў Салігорску, Баранавічах, а ў найбліжэйшы час далучацца Пінск і Орша. Прыкладна 20 пацыентам з дапамогай інтэрвенцыйных метадаў былі імплантаваны клапаны сэрца, што таксама хутка будзе ажыццяўляцца ў рэгіёнах. Наогул 77 працэнтаў аперацыйных умяшанняў выконваюцца ў кардыяхірургічных аддзяленнях абласных цэнтраў.

**Святлана БАРЫСЕНКА.** *protas@zviazda.by*

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

# Першыя, сапраўдныя, любімыя...

## Топ-10 фільмаў пра настаўнікаў

**У першую нядзелю кастрычніка беларусы па традыцыі будуць віншаваць работнікаў адукацыйнай галіны з прафесійным святам — Днём настаўніка. Акрамя таго, 5 кастрычніка больш як 100 краін ужо 23 гады запар адзначаюць заснаваны ЮНЕСКА Сусветны дзень настаўнікаў. Напярэдадні святочных дат «Звязда» прапануе ўзгадаць — а мо і перагледзець наноў — 10 знакавых фільмаў пра школу і педагогаў з вялікай літары, якія дробнымі крокамі мяняюць да лепшага свет і людзей вакол сябе.**



### «Рэспубліка ШКІД» (1966)

Час дзесьці паміж Кастрычніцкай рэвалюцыяй і грамадзянскай вайной. Школа-камуна імя Дастаеўскага, у якой сабраліся, з аднаго боку, «шкідаўцы», падлеткі-беспрытульнікі — чытай, юныя злачынцы рознай масці, а з другога — педагагічны калектыў «халдзееў» пад кіраўніцтвам Віктара Мікалаевіча Сарокі-Расінскага, якога выхаванцы перайменавалі ў Вікніксора. Перад настаўнікамі-энтузіястамі стаіць сапраўды тытанічная і, як часам падаецца, невыканальная задача — перакаваць тых, чые характары ўжо вылепілі і загартавалі вуліцы Петраграда...

### «Дажывём да панядзелка» (1968)

Бадай, гэту карціну ўспамінаюць першай, гаворачы пра вобраз настаўніка ў кіно. Гісторыя даўжынёй у тры дні — з чацвярга да суботы — і ў некалькі пакаленняў настаўнікаў і вучняў, якія будуюць стасункі адно з адным, вучаць і вучацца самі, адстойваюць уласныя перакананні і ідуць на кампрамісы, памыляюцца і дасягаюць вышыняў. Фільм аказаўся настолькі пераканаўчым, што самі педагогі, дэлегаты II Усесаюзнага з'езда настаўнікаў, стоячы апладзіравалі аўтарам і акцёрам.

### «Вялікі перапынак» (1972—1973)

Яшчэ адно культавае кіно пра школу. На гэты раз вячэрнюю, многія наведвальнікі якой старэйшыя і значна больш вопытныя за маладога настаўніка Нестара Северава, але пры сутыкненні з тыповымі школьнымі праблемамі часта паводзяць сябе як вялікія дзеці.

Вядома, фільм мог бы атрымацца зусім іншым — калі б першапачатковая назва «Прыгоды школьнага настаўніка» не выклікала хвалю абурэння ў педагогаў (замяніць назву рэжысёра папрасіў асабіста міністр асветы), а роля настаўніка дасталася б Андрэю Мягкову або Канстанціну Райкіну. Каханай галоўнага героя магла стаць Святлана Кручкова, а хулігана Ганжу «прымяралі» Станіслаў Садальскі і Аляксандр Філіпенка. Але ўсё ж менавіта той акцёрскі ансамбль, які падабраўся на здымках, зрабіў карціну асабліва светлай і добрай. Зняты матэрыял настолькі спадабаўся кіраўніцтву студыі «Тэлефільм», што з 2-серыйнага фільм вырас у 4-серыйны. Магла б атрымацца і пятая серыя, — але ў здымачнай групы банальна скончыліся адведзеныя грошы і час.

### «Ключ без права перадачы» (1976)

У звычайнай ленінградскай школе з'яўляецца новы дырэктар — адстаўны армейскі афіцэр. Ці знойма былы вайсковец стаць добрым кіраўніком, калі старшакласнікі лічаць яго «абмежаваным салдафонам» і абапіраюцца на іншыя аўтарытэты — у прыватнасці на маладую прагрэсіўную настаўніцу літаратуры, блізкую ім па духу?

Але аднойчы запісаная на плёнку дыскусія настаўніцы з вучнямі, падчас якой сказана шмат непрыемнага пра іншых выкладчыкаў, выпадкова трапляе ў рукі бацькоў адной са школьніц. Разгараецца вялікі канфлікт, які пагражае паглынуць усю школу, — і тут, як ні дзіўна, менавіта новы дырэктар знаходзіць выйсце...

### «Урокі французскай» (1978)

У галодныя пасляваенныя гады маці выпраўляе 11-гадовага Валодзю з вёскі ў райцэнтр — вучыцца, каб выбіцца ў людзі. Хлопчык пасяляецца ў цёткі, шматдзетнай маці-адзіночкі, і каб перамагчы малакроўе, павінен штодня выпіваць шклянку малака. Каб здабыць грошы, Валодзя вымушаны гуляць у «чыку» — але, выйграўшы патрэбны рубель, адразу выходзіць з гульні. Раззлаваныя яго пастаянным шанцаваннем, падлеткі аднойчы моцна пабілі хлопца. Сінія гузакі заўважыла маладзенькая настаўніца французскай мовы Лідзія Міхайлаўна — і пад маркай дадатковых заняткаў пастаралася дапамагчы хлопцу, ахвяраваўшы ў выніку ўласнай школьнай кар'ерай...

У экранізацыі аднайменнага апавядання Валянціна Распуціна здарыліся ідэальныя пападанні ў ролі. Дзетдомавец Міша Ягораў, як гэта часта бывае, «перайграў» многіх прафесійных акцёраў, а актрыса Яўгенія Ташкова выдатна перадала ідэю добрасардэчнасці і любові-спачування — якасцяў, якія сёння ў вялікім дэфіцыце.

### «Таварыства мёртвых паэтаў» (1989)

Гэты галівудскі фільм-драма з бліскучым Робінам Уільямсам заснаваны на рэальных стасунках выкладчыкаў і навучэнцаў прэстыжных прыватных школ — можа, таму ён і атрымаў «Оскар» за найлепшы сцэнарый і прыз Брытанскай акадэміі як найлепшы фільм 1989-га? А фраза з фільма «Carpe Diem». «Лавіце момант, хлопцы. Зрабіце сваё жыццё экстраардынарным», між іншым, увайшла ў топ-100 найлепшых кінацытат па версіі Амерыканскага інстытута кіно.

Джон Кітынг выкладае ў кансерватыўным каледжы для хлопчыкаў, прынцыпы якога «Традыцыі», «Гонар», «Дысцыпліна» і «Дасканаласць» як нельга лепей адлюстроўваюць атмасферу навучальнай установы, што заціскае юнацкія душы ў жорсткія рамкі. Аднак пакуль ягоныя калегі развагаюць пра арыстакратызм, харызматычны настаўнік літаратуры пасвячае вучняў у таямніцу «таварыства мёртвых паэтаў» і вучыць крыху спешчаных, але ў цэлым звычайных хлопцаў мысліць, адчуваць, ствараць — быць самімі сабой, а не прыстасоўвацца. Натуральна, праўда нонканфармізму далёка не ўсім падабаецца, і за яе выкладчыку давядзецца несці адказнасць па поўнай.

### «Чалавек эпохі Адраджэння» (1994)

Камедыя з Дэні дэ Віта была негатыўна ўспрынятая гледачамі і крытыкамі, таму праз некаторы час выйшла ў пракат пад іншай назвай.

Звольнены супрацоўнік рэкламнага агенцтва Біл Рэга, які аказаўся няздатным да іншых спраў, ад безвыходнасці вымушаны пагадзіцца на месца настаўніка ў трэніровачным армейскім лагеры. Працуе ён, натуральна, зусім без імпэту. Яшчэ меншую цікавасць да заняткаў праяўляюць вучні — у асноўным маладыя і далёкія ад любой навукі салдаты, «прабіць» браню якіх удаецца з дапамогай «Гамлета» Шэкспіра. Гісторыя атрымалася, безумоўна, наіўнай казкай пра ператварэнне групы ёлупаў у каманду аднадумцаў, — але пры тым добрай, забаўнай і аптымістычнай.

### «Харысты» (2004)

І зноў фільм пра цяжкіх падлеткаў, — але на гэты раз падзеі разгортваюцца ў Францыі 1949 года, дзе настаўнік музыкі Клемент Мацье на справе даказвае, што дабрынёй і чуласцю можна дасягнуць большага, чым строгасцю і жалезнай дысцыплінай.

### «Клас» (2008)

Залатую пальмавую галіну на Канскім фестывалі так проста не даюць, але гэта французская драма ўзнагароду сумленна заслужыла. Сюжэт, здавалася б, даўно знаёмы: настаўнік-энтузіяст Франсуа Бежадо стараецца скіраваць на добры шлях старшакласнікаў, мякка кажучы, з непрэстыжных гарадскіх раёнаў. Аднак ёсць адно істотнае «але»: звычайныя праблемы ўскладняюцца расавымі непаразуменнямі, бо значная частка вучняў — імігранты розных нацыянальнасцяў, вымушаныя ўжывацца ў адной школе. Пагрозамі і пакараннямі ад падлеткаў нічога не дабіцца, і тады настаўнік кліча на дапамогу ўсё сваё цярпенне і спагадлівасць...

### «Настаўнік на замену» (2011)

Генры Барт працуе часовым настаўнікам англійскай літаратуры, які падмяняе хворых або адсутных калег. Чарговае прызначэнне прыводзіць яго ў школу для «неўладкаваных» падлеткаў, на якіх адкрыта начхаць усім, — і прыстойнаму грамадству ў цэлым, і іншым выкладчыкам, і ўласным бацькам.

Гэтае адчужэнне, нежаданне грамадства ўнікнуць у праблемы расізму, школьнага насілля і бездапаможнасці педагогаў — не фон для выпрабаванняў, якія пад бадзёрую музыку пераадольваюць героі, а галоўная і вельмі вострая праблема, што не прадугледжвае шчаслівага фіналу. Сапраўды, хіба здольны адзін неабыякавы настаўнік, да сэрца якога дастукаліся падлеткі, пераадолець татальны хаос?.. Як трапна адзначылі расійскія кінакрытыкі, пасля прагляду гэтай філасофскай амерыканскай драмы нашумелы фільм «Школа» Валерыі Гай Германікі нагадвае жыццярадасную сцэнку.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.** *tselyashuk@zviazda.by*

### Банджорна, бамбіні!



У спіс вартых прагляду можна ўнесці некалькі дзясяткаў карцін, але, на наш погляд, без бенефісу Генадзя Хазанава — «ералашаўскай» серыі «40 чарцей і адна зялёная муха» (1984) — гэты спіс будзе няпоўным. Кароткая, але такая выразная і павучальная гісторыя, знятая па аднайменным апавяданні Джавані Моска, за нейкія пяць з паловай хвілін бліскуча паказвае, што настаўніцкі аўтарытэт і павага вучняў — рэчы не безумоўныя, іх трэба яшчэ ўмець заваяваць і ўтрымаць.

## «СМАК ЖЫЦЦЯ СА «ЗВЯЗДОЙ»

**Калі вы падпісаліся на газету «Звязда» на IV квартал або II паўгоддзе 2017 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце да 9 кастрычніка 2017 года ў рэдакцыю на адрас: вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013, г. Мінск.**

**Сярод падпісчыкаў 12.10.2017 года будуць разыграны 7 вяндлярняў электрычных «ТэрмМікс» і суперпрыз — маразільнік Indesit. Вынікі будуць апублікаваны ў газеце «Звязда» да 22.10.2017 года.**

**Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі да 31.12.2017 года пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на IV квартал або II паўгоддзе 2017 года і пашпарта. Пасля 31 снежня выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца. Умовы рэкламнай гульні «Смак жыцця са «Звяздой» чытайце ў нумары 171 газеты «Звязда» ад 06.09.2017 года.**

**Тэлефон для даведак (017) 337 44 04.**

**Тэрмін правядзення гульні — з 7.09.2017 да 31.12.2017.**

**Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №3087 ад 04.09.2017 года выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.**



МАРАЗІЛЬНІК Indesit SFR 100



Вяндлярня электрычная суцэльнаметалічная «ТэрмМікс»

**Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на IV квартал або II паўгоддзе 2017 года**

Прозвішча, імя, імя па бацьку ____________________

______________________________

Падпіска аформлена і аплачана ў ____________________
(аддзяленне сувязі)
на IV квартал або II паўгоддзе 2017 года

Хатні адрас і тэлефон (абавязкова) __________ (індэкс) __________

______________________________

______________________________

Удачы ў розыгрышы!




УНП 690262864

## Аўторак, 3 кастрычніка

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 0.45** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 18.15, 0.25** Зона Х (16+).
**9.10, 22.10 Серыял «След». (16+).**
**10.55, 12.10, 18.35, 19.20 Серыял «Жаночы доктар-3». (16+).**
**13.10** Дзіцячы доктар.
**13.45** Дзень у вялікім горадзе.
**14.45, 15.25 Серыял «Спявачка». (16+).**
**15.15, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** Беларуская часінка.
**21.00** Панарама.
**21.50** Спецыяльны рэпартаж (12+).
**0.05** Сфера інтарэсаў.
**1.00** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца (12+).
**9.00, 19.10** Тэлебарометр.
**9.05, 17.05 Драма «Помста». (16+).**
**11.15, 22.10** «Нераскрытыя тайны». (12+).
**11.50 Трылер «Тут хтосьці ёсць...» (16+).**
**14.00, 20.25** «Панаехалі-2. Канікулы ўсляпую». (16+).
**15.15, 22.50 Серыял «Іх перабылталі ў раддоме». (16+).**
**16.20, 23.45** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект (12+).
**19.15** «Паненка-сялянка». (16+).
**21.30** «Багіня шопінгу». (16+).
**22.05** Спортлато 6 з 49, КЕНО.

### Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35, 14.25** «Беларуская кухня». Локшыны.
**8.05, 12.00, 20.00** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.20, 12.15, 15.25, 20.15, 22.35** «Гэты дзень».
**8.25, 18.35 «Маргарыта Назарава». Меладрама. 1-я серыя. (16+).**
**9.20, 15.30 «Царскае паляванне». Драма. 1-я серыя. (16+).**
**10.25** «Свет дзіўных сноў, як манускрыпт...» Ігар Палівода.
**10.55** «Святло далёкай зоркі». Памяці мастака Мікалая Дучыца.
**11.20, 18.00** «Апошні дзень». Валянціна Сярова (12+).
**12.20** «Вялікія мастакі». Вінцэнт Ван Гог (12+).
**13.15** «Гуляй, душа: праграма беларускага дзяржаўнага ансамбля народнай музыкі «Свята».
**14.55** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**16.35, 21.05** «Яны спявалі за Радзіму». Песня «Свяшчэнная вайна».
**17.05, 21.35 «Аперацыя «Гаргона». Драма. 1-я серыя. (16+).**
**19.30** «Ваша лато», «Пяцёрачка».
**20.20** «Твар у твар». Выпуск пяты.
**20.40** «Калыханка» (0+).
**22.20** «Песні пад гітару».
**22.40** «Музыка і фарбы». Дак. фільм (12+).

### Беларусь 5

**7.30, 12.30** Тэніс. Турнір WTA. Пекін.
**9.20** Спорт-мікс.
**9.30, 23.05** Спартыўныя танцы. Міжнародны турнір.
**10.30** Хакей. КХЛ. «Дынама-Мінск» — «Дынама» (Масква).
**13.45** Час футбола.
**16.35** Піт-стоп.
**17.05** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**18.05** «Нашы. Анатоль Буяльскі».
**18.20** Спорт-кадр.
**18.55** Хакей. Ліга чэмпіёнаў. «Ювескулля» (Фінляндыя) — «Нёман» (Беларусь). (У перапынках — Спорт-цэнтр.)
**21.15** Спорт-цэнтр.
**21.25** Гандбол. SEHA-Газпром ліга. БГК імя Мяшкова (Беларусь) — «Нэксе» (Харватыя).

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00** (з субцітрамі), **7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05, 7.05, 8.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здарова!» (12+).
**10.10 Серыял «Выдатніца» (16+).**
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**11.10, 23.50** «Модны прыгавор» (12+).
**12.05** «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
**13.10** «Давай пажэнімся!» (16+).
**14.20, 16.20** «Час пакажа» (16+).
**16.55** «На самай справе» (16+).
**18.20** «Кантрольная закупка» (12+).
**18.55** «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
**19.00** «Няхай гавораць» (16+).
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Бацькаў бераг» (16+).**
**23.10** «Вячэрні Ургант» (16+).
**0.50** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою» (6+).
**7.40, 20.10, 23.00** «СТБ-спорт».
**8.30, 18.35** «Тайны Чапман» (16+).
**9.35, 17.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы» (16+).
**10.30** «24 гадзіны».
**10.40, 1.05 Камедыя «Формула кахання» (6+).**
**12.20, 22.00** «Глядзець усім!» (16+).
**12.35, 23.05** «Загадкі чалавецтва» (16+).
**13.50 Маст. фільм «Тэрмінал» (12+).**
**16.00** «Цэнтральны рэгіён».
**16.50** «Салдаты і афіцэры» (16+).
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15 Меладрама «Мексіканец» (16+).**
**23.05** «Аўтапанарама» (12+).
**23.25** «Тэрыторыя памылак» (16+).

### МІР

**6.00, 16.15, 18.05, 5.35 Серыял «Вяртанне Мухтара-2» (16+).**
**7.30** Добрай раніцы, свет! (16+).
**8.35** «Няма праблем» (16+).
**10.00, 13.15 Серыял «Фаварыт» (16+).**
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**14.25, 2.45** «Іншы свет». Знікненне блізкага чалавека (12+).
**15.00** «Справы сямейныя» (16+).
**19.20 Серыял «Аддзел 44» (16+).**
**23.10 Маст. фільм «Іван» (6+).**
**1.00 Маст. фільм «Салон прыгажосці» (0+).**
**4.05 Маст. фільм «Пятнаццацігадовы капітан» (12+).**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.40** «Пакой смеху». (16+).
**12.00, 20.40 Серыял «Тайны следства». (12+).**
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу. (12+).
**15.45** «60 хвілін». Ток-шоу.
**17.35** «Лёс чалавека». (12+).
**18.45** «Андрэй Малахаў. Прамы эфір». (16+).
**22.10** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым. (12+).
**22.30, 23.10 Серыял «Прынада для анёла». (12+).**
**0.10** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».
**1.35** Урачыстая Цырымонія ўручэння прэміі ТЭФІ.

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.10, 7.10** «Дзелавая раніца НТБ». (12+).
**8.05 Серыял «Таксістка». (16+).**
**8.55 Серыял «Вяртанне Мухтара». (16+).**
**9.45, 23.10** «НЗ.by».
**10.20, 19.40** Дзённікі «Удача ў прыдачу!» з «Еўраопт».
**10.25 Серыял «Ляснік». (16+).**
**12.05** «Суд прысяжных». (16+).
**13.25, 18.25** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.05** «Месца сустрэчы». (16+).
**16.35 Серыял «ППС». (16+).**
**17.25 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў». (16+).**
**19.45 Серыял «Неўскі». (16+).**
**21.20 Серыял «Справа гонару». (16+).**
**23.30 «Вынікі дня».**
**0.00 Серыял «Агенцтва схаваных камер». (16+).**

### 8 канал

**7.00, 15.55, 19.45, 21.00, 23.55** «Надвор'е».
**7.05** «Сябры дзядулі Марка».
**7.30** Раніца на восьмым.
**10.30** «Мой любімы гадаванец».
**11.00 Меладрама «Іншая сястра».**



**13.05 Серыял «Жорсткае каханне».**
**14.30, 18.20, 20.45** «Дома ТБ» прадстаўляе».
**14.50 Камедыя «Ехалі ў трамваі Ільф і Пятроў».**
**16.00** «Мультпарад».
**16.55 Серыял «Дарагі доктар» (12+).**
**18.40 Серыял «Выратаваць боса» (12+).**
**19.50 Серыял «Дама пад вуаллю» (16+).**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**21.15 Камедыя «Фрэнкі і Джоні». (16+).**
**23.10 Серыял «Затрымка ў развіцці».**

### ВТБ

**6.00, 15.15** Серыял «Вароніны». (12+).
**7.20** «Дурні і дарогі». (16+).
**7.40, 4.20** М/ф «Смяшарыкі». (0+)
**8.10, 4.40** М/ф «Фіксікі». (0+)
**8.25, 4.55** М/ф «Чычылэнд». (0+)
**8.40, 3.50** «Ералаш». (6+)
**9.30, 19.00** Серыял «Маладзёжка-5». (12+).
**10.40** Баявік «Ямакасі, або Новыя самураі». (12+).
**12.40, 5.10** Скетч-шоу «6 кадраў» (16+).
**13.00** «Паспець за 24 гадзіны». (16+).
**14.10, 20.10** Серыял «Два бацькі і два сыны». (16+).
**16.45** Серыял «Прынц Сібіры». (16+).
**17.50, 23.20** «Уральскія пельмені». (16+).
**21.20** Камедыя «Мы — легенды». (12+).
**0.00** Серыял «Гульня». (16+).
**0.50** Серыял «Бязмоўны сведка». (16+).
**1.50** Серыял «Закрытая школа». (16+).
**3.30** «Лаві момант». (16+).

### Культура

**6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 10.00, 15.00, 19.30, 0.00** Навіны культуры.
**6.35** Хто ў доме гаспадар.
**7.05** «Легенды сусветнага кіно». Іна Гулая.
**7.35** «Падарожжы натураліста».
**8.05, 21.10** «Правілы жыцця».
**8.35, 22.20** «Абацтва Даўнтан». Маст. фільм.
**9.25, 15.55, 17.25, 23.10** Сусветныя скарбы.
**9.40** Галоўная роля.
**10.15, 18.30** «Назіральнік».
**11.10, 0.55** ХХ стагоддзе. «Ці не дапеўшы куплета. Памяці Ігара Талькова». 1992 г.
**12.30** «Магістр гульні». «Выратаваны імгненнем. Фауст».
**13.00** «Саці. Нясумная класіка...»
**13.40, 20.05** «Свет Стоўнхенджа». Дак. фільм.
**14.30** «Рэгтайм, або Разарваны час».
**15.10, 2.10** «Эміль Гілельс. Адзіны і непаўторны». Дак. фільм.
**16.15** «Эрмітаж».
**16.40** «2 Вернік 2».
**17.45** 90 гадоў з дня нараджэння Ігара Таланкіна. «Нябачнае падарожжа душы». Дак. фільм.
**19.45** Галоўная роля.
**20.55** «Добрай ночы, малыя!»
**21.40** Штучны адбор.
**23.30** «У цярновым вянку рэвалюцый». «Ліхалецце».
**0.15** «Тым часам».

### Настальгія

**6.00** «Замежная эстрада». 1988 год (12+).
**7.20** «У гасцях у М. Магамаева». Элвіс Прэслі. 1991 год (12+).
**8.15, 15.40, 17.00, 21.40, 23.00, 23.40, 1.20, 2.50, 3.50, 5.35** Музычная настальгія (12+).
**9.00** Маст. фільм «Чарадзеі» (12+).
**11.30** Серыял «33 квадратныя метры. Дачныя гісторыі» (16+).
**12.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Тэлебачанне Перабудовы: праграма «Погляд». 2006 год (16+).
**13.10** Дак. фільм «Эканоміка ў пошуках ісціны» (12+).
**13.40** Маст. фільм «Мера стрымання» (16+).
**15.00, 21.00** «Мінулы час» (12+).
**16.00, 22.00** «Народжаны ў СССР» (12+).
**17.25** Праграма «Чалавек і закон». 1987 год (16+).
**17.55** Праграма «Тэма» з Уладзіславам Лісцьевым: «Па абодва бакі закона». 1992 год (16+).
**18.40** Маст. фільм «Начныя забавы» (16+).
**23.20** «Час пік» з Андрэем Разбашам. 1995 год (12+).
**0.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1990. 2-я частка. 2010 год (16+).
**1.10** Дак. фільм «Навіны дня. Хроніка нашых дзён» (12+).
**1.35** Маст. фільм «Арбацкі матыў». 2-я серыя (16+).
**3.00** «Быў час». 2008 год (16+).
**4.00** Маст. фільм «Добры дзень, я ваша цётка!» (16+).

### EuroSport 1

**4.00, 9.30, 20.00** Снукер. European Masters.
**6.00, 9.00, 13.30, 19.00** Футбол. Чэмпіянат MLS.
**11.30, 16.00** Веласпорт. Кубак Італіі.
**12.30, 2.15** Watts.
**15.00** Веласпорт. «Еўраметраполь».
**17.30** Скачкі з трампліна. Летні Гран-пры.
**18.30** «Найлепшае з коннага спорту».
**19.30** «Дух парусннага спорту».
**0.00** Аўтагонкі. Серыя Blancpain Endurance.
**1.00** Аўтагонкі. Серыя WTCC.
**1.15** Ралі-рэйд.
**2.30** Супербайк. Этап чэмпіянату свету.

### Кінакамедыя

**0.25** Камедыя «Піўная ліга». (16+).
**1.55** Камедыя «Галівудскі фінал». (12+).
**3.50** Камедыя «Забойны футбол». (16+).
**5.40** Камедыя «Украдзі маю жонку». (16+).
**7.20** Камедыя «Зачыншчыкі». (16+).
**9.00** Камедыя «Шалёныя грошы». (16+).
**10.45** Камедыя «Чалавек-аркестр». (12+).
**12.20** Камедыя «Няўдачлівыя». (16+).
**14.00, 14.50, 15.35** Скетчкам «Паміж намі». (16+).
**14.25, 15.10** «Шоу Камедыянтаў». (16+).
**16.10** Меладрама «Мымра». (16+).
**17.40** Камедыя «Тата напракат». (12+).
**19.30** Камедыя «Суперсцюард». (16+).
**21.15** Камедыя «Няправільныя копы». (18+).
**22.40** Меладрама «Вялікая маленькая Я». (16+).

### ТБ3

**6.00** М/ф (6+).
**8.25** «Доктар І...» (16+).
**8.55, 19.05, 2.00** «Каралёк — птушачка пявучая». Серыял (16+).
**10.35, 3.40** «Судовыя страсці». Дак. серыял (16+).
**12.15** «Сляпая» (12+).
**13.15** «Варажбітка» (12+).
**14.15, 5.10** «Паралельны свет» (12+).
**15.10** «Трэндзі» (16+).
**15.40** «Здзелка» (16+).
**16.10** «Натуральны адбор» (12+).
**17.10** «Адкрыта» (12+).
**18.05** «Другое дыханне». Серыял (16+).
**20.55** «Вакол свету. Мясціны сілы» (16+).
**21.55** «Рэвізора» (16+).
**23.00** «Гісторыі выратавання» (16+).
**23.30** «Легенда пра Шукальніка». Серыял (16+).
**0.15** «Ганебная страсць». Трылер (16+).

### ТБ1000

**6.10, 18.15** Дзень сурка (12+).
**8.05** Двое ў Сусвеце (16+).
**10.25** Авіятар (12+).
**13.40** Там, дзе сэрца (16+).
**16.00** Не ў сабе (16+).
**20.10** Матрыца (16+).
**22.45** Не здавайся (16+).
**0.30** Зільс-Марыя (18 +).
**2.40** Апантанасць (16+).
**4.25** Барвовыя рэкі (16+).

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Рускі трохвугольнік. (16+).
**8.40** Увесь гэты джэм. (16+).
**10.35** Кампенсацыя. (16+).
**12.25** Белы Бім Чорнае вуха. 2-я серыя. (6+).
**14.20** Чалавек у футарале, чалавек у паліто і чалавек у фраку. (12+).
**16.20, 4.20** Дазвольце цябе пацалаваць. (16+).
**18.20** Добры хлопчык. (12+).
**20.20** Дуэлянт. (16+).
**22.35** Бармен. (16+).
**0.25** Аднойчы. (16+).
**2.25** Душа шпіёна. (16+).

### National Geographic

**6.00** Папулярная навука. (12+).
**6.45, 17.15, 20.10** Гульні розуму. (12+).
**7.35, 22.25** Зрабі або памры. (12+).
**7.55, 10.15, 14.50** Мегазаводы. (12+).
**8.40** Міжнародны аэрапорт Дубай. (12+).
**9.30** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха. (12+).
**11.00** Шаша праз пекла. (12+).
**11.45** Аўта-SOS. (12+).
**12.30, 15.40** Марс. (12+).
**13.20** Чалавек супраць YouTube. (12+).
**14.05, 18.00, 20.55, 0.45, 3.50, 5.35** Навуковыя недарэчнасці. (12+).
**16.30, 19.25, 0.00, 2.15** Расследаванні авіякатастроф. (12+).
**18.45** Зорная размова. (16+).
**21.40, 1.30, 4.45** Твар у твар. (16+).
**22.50** Код небяспекі. (12+).
**23.15, 3.05** Уварванне на Зямлю. (16+).

### Discovery

**8.00, 17.00, 22.00, 4.40** Махінатары. (12+).
**9.00, 15.30, 21.30, 6.45** Як гэта ўстроена? (12+).
**9.30, 15.00, 21.00,6.20** Харчовая фабрыка. (6+).
**10.00, 16.00, 23.00, 3.50** Танкі. (12+).
**10.30, 16.30, 23.30, 4.15** Склады: бітва ў Канадзе. (12+).
**11.00** Аўтальянцы. (16+).
**14.00** Аляска: сям'я з лесу. (16+).
**18.00** Хуткія і гучныя. (12+).
**19.00** Залатая ліхаманка. (16+).
**0.00** Востраў. (16+).
**1.00, 7.10** Вулічныя гонкі. (16+).
**2.00** Самагоншчыкі. (18+).
**2.55** Гандляры космасам. (12+).
**5.30** Маланкавыя катастрофы. (16+).




## ГОДЗЕ ПІШЧОМ У РАДЦЫ ЛЕЗЦІ

**Штотыдзень у эфіры тэлеканала «Беларусь 3» гульня «Размаўляем па-беларуску». Для таго каб стаць яе ўдзельнікамі, неабходна зайсці на сайт tvrgomel.by або 3belarus.by і праз банер «Размаўляем па-беларуску» запоўніць заяўку на каманду з трох чалавек. Ну, а праверыць сваё веданне роднай мовы пасля таго, як праграма выйшла ў эфір, можна з дапамогай «Звязды». Ці ведалі вы, што:**

**валаво́ка —** лясная птушка атрада вераб'іных *(па-руску такую птушку называюць «крапивник» або «подкоре́нник», «оре́шек»);*

**шру́ба —** вінт *(«Юзік перамацаў кожную шрубу і кожны зуб на барабане», — чытаем у Кандрата Крапівы);*

**годзе (прыслоўе) —** хопіць, даволі;

**пішчом (прыслоўе) —** настойліва, упарта *(ужываецца ў выразе «пішчом лезці» — што значыць намагацца з усяе сілы, магчымасці);*

**радца (адно са значэнняў) —** той, хто раіць, дае параду *(у XIV—XVIII стагоддзях радцам яшчэ называлі выбранага ад багатых гарадскіх вярхоў у раду);*

**мыслівы (абласное) —** паляўнічы, які вядзе нагляд за дзікімі жывёламі, той самы егер;

**як мёртваму прыпаркі —** нікольки, зусім, нічога не дапаможа *(беларусы яшчэ скажуць: як мёртваму кадзіла, як хваробе кашаль. Руская: как мёртвому припарка);*

**з горла прэ —** празмерна шмат чаго-небудзь у каго-небудзь. *(беларускія сінонімы: без меры, да гібелі, да хваробы, да ліха, да чорта, хоць гаць гаці, у кожнай кішэні па жмені, повен рот, плюнуць некуды, цьма цьмушчая, хоць плот гарадзі. Рускія адпаведнікі: бери не хочу, конца края нет).*

***Чарговыя выпускі тэлевіктарыны глядзіце ў эфіры «Беларусь 3» раніцай кожную суботу.***

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
*iost@zviazda.by*

## Тэлесеткі

### Хачу ўсё ведаць!

**Ніводны чалавек на Зямлі не валодае абсалютнымі ведамі ва ўсіх сферах. А вось хто з беларускіх школьнікаў можа пахваліцца шырокай эрудыцыяй, кемлівасцю, ініцыятыўнасцю і ў дадатак творчымі здольнасцямі, будуць высвятляць Белтэлерадыёкампанія і Міністэрства адукацыі, якія рэалізуюць сумесны праект — інтэлектуальнае шоу «Я ведаю!». Першы выпуск гледачы ўбачаць ужо ў наступную суботу, 7 кастрычніка.**

Таленавітыя вучні 5—11 класаў з усёй краіны, якія папярэдне прайшлі адборы ў сваіх рэгіёнах, аб'ядноюцца ў каманды па паралелях. Пад кураторствам вядучых тэлепраекта — Георгія Калдуна і Дзмітрыя Новіка — школьнікі будуць выконваць цікавыя, але няпростыя заданні, спаборнічаючы за каштоўныя прызы і тытулы пераможцаў. «Наша задача — не зладзіць банальную віктарыну або іспыт, а стварыць такую камфортную атмасферу, у якой дзеці і падлеткі школьнага ўзросту змогуць найбольш поўна раскрыцца, паказаць сваю эрудыцыю і кругагляд, — адзначае Георгій Калдун. — Таму мы пастараемся, каб школьнікі не толькі праверылі свае веды і адтачылі лагічнае мысленне, але і атрымалі добрыя эмоцыі і карысны вопыт».

Як плануецца, у эфіры будуць паказаны 33 выпускі праекта, а ў фінальных гульнях вызначаць 7 пераможцаў з кожнай паралелі.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
*tselyashuk@zviazda.by*

## Серада, 4 кастрычніка

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 0.45** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 18.15, 0.25** Зона Х (16+).
**9.10, 22.10 Серыял «След». (16+).**
**10.55, 12.10, 18.35, 19.20 Серыял «Жаночы доктар-3». (16+).**
**13.10** Дзіцячы доктар.
**13.45** Дзень з вялікім горадзе.
**14.45, 15.25 Серыял «Спявачка». (16+).**
**15.15, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** Беларуская часінка.
**21.00** Панарама.
**21.50** Актуальнае інтэрв'ю.
**0.05** Сфера інтарэсаў.
**1.00** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца (12+).
**9.00, 19.10** Тэлебарометр.
**9.05, 17.05 Драма «Помста». (16+).**
**11.15, 22.10** «Нераскрытыя тайны». (12+).
**12.00 Трылер «Тут хтосьці ёсць...» (16+).**
**14.05, 20.20** «Бітва салонаў». (16+).
**15.15, 22.50 Серыял «Іх пераблыталі ў раддоме». (16+).**
**16.20, 23.45** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект (12+).
**19.10** «Паненка-сялянка». (16+).
**21.25** «Багіня шопінгу». (16+).
**22.00** Спортлато 5 з 36, КЕНО.

### Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35, 14.40** «Беларуская кухня». Рулька ў піве.
**8.05, 12.00, 20.00** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.20, 12.15, 15.30, 22.35** «Гэты дзень».
**8.25, 18.35 «Маргарыта Назарава». Меладрама. (16+).**
**9.20, 15.30 «Царскае паляванне». Драма. 2-я серыя. (16+).**
**10.30** «Справа жыцця». Рэжысёр Анатоль Алай.
**10.50** «Святло далёкай зоркі». Памяці дырыжора, кампазітара Аляксандра Майзлера.
**11.20, 18.00** «Апошні дзень». Аляксандр Парахаўшчыкоў (12+).
**12.20** «Вялікія мастакі». Леанарда да Вінчы (12+).
**13.15** «Чароўны свет аперэты». Канцэрт з удзелам сімфанічнага аркестра Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага музычнага тэатра.
**15.05** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**16.35, 21.05** «Яны спявалі за Радзіму». Песня «Эх, дороги...»
**17.05, 21.30 «Аперацыя «Гаргона». Драма. (16+).**
**19.30** «Легенды беларускай эстрады». «Застанься са мною...» «Сябры».
**20.10** «Камертон». Народны артыст Беларусі Ігар Алоўнікаў.
**20.40** «Калыханка» (0+).
**22.20** «Песні пад гітару».
**22.40** «Прадам бясхмарнае неба». Дак. фільм (12+).

### Беларусь 5

**7.30, 10.30** Тэніс. Турнір WTA. Пекін.
**9.20** Спорт-мікс.
**9.30, 22.15** Спартыўныя танцы. Міжнародны турнір.
**13.30** Хакей. Ліга чэмпіёнаў. «Ювескулля» (Фінляндыя) — «Нёман» (Беларусь).
**15.25** Спорт-кадр.
**15.55** Гандбол. SEHA-Газпром ліга. БГК імя Мяшкова (Беларусь) — «Нэксе» (Харватыя).
**17.30** Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. Відэачасопіс.
**18.00** Козел пра футбол.
**18.20** Слэм-данк.
**18.50** «Нашы. Юрый Шаўцоў».
**19.05** Авертайм. КХЛ.
**19.25** Хакей. КХЛ. «Дынама-Мінск» — «Барыс» (Астана). (У перапынках — Авертайм. КХЛ.)
**22.05** Спорт-цэнтр.
**23.25** Плаванне. Этап Кубка свету. Доха.

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00** (з субцітрамі), **7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05, 7.05, 8.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здарова!» (12+).
**10.10 Серыял «Выдатніца» (16+).**
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**11.10, 23.50** «Модны прыгавор» (12+).
**12.05** «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
**13.10** «Давай пажэнімся!» (16+).
**14.20, 16.20** «Час пакажа» (16+).
**16.55** «На самай справе» (16+).
**18.20** «Кантрольная закупка» (12+).
**18.55** «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
**19.00** «Няхай гавораць» (16+).
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Нюхач» (16+).**
**23.10** «Вячэрні Ургант» (16+).
**0.50** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою» (6+).
**7.40, 20.10, 23.00** «СТБ-спорт».
**8.30, 18.35** «Тайны Чапман» (16+).
**9.35, 17.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы» (16+).
**10.40, 0.45 Камедыя «Міміно» (12+).**
**12.20, 22.00** «Глядзець усім!» (16+).
**12.35, 23.05** «Загадкі чалавецтва» (16+).
**13.50 Меладрама «Мексіканец» (16+).**
**16.10** «Аўтапанарама» (12+).
**16.50** «Салдаты і афіцэры» (16+).
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15 Меладрама «Каханне і іншыя непрыемнасці» (12+).**

### МІР

**6.00, 16.15, 18.05, 5.35 Серыял «Вяртанне Мухтара-2» (16+).**
**7.30** Добрай раніцы, свет! (16+).
**8.35** «Няма праблем» (16+).
**10.00** М/ф «Маша і Мядзведзь» (0+).
**10.15** «Любімыя акцёры». Георгій Буркоў (12+).
**10.45** «Любімыя акцёры». Наталля Крачкоўская (12+).
**11.15 Маст. фільм «Салон прыгажосці» (12+).**
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15 Серыял «Хатняя работніца» (16+).**
**14.25, 2.50** «Іншы свет». Што рабіць, калі не застаецца сіл? (12+).
**15.00** «Справы сямейныя» (16+).
**19.20 Серыял «Аддзел 44» (16+).**
**1.00 Маст. фільм «Іван» (6+).**
**4.10 Маст. фільм «Цырк» (0+).**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.40** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым. (12+).
**12.00, 20.40 Серыял «Тайны следства». (12+).**
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу. (12+).
**15.45** «60 хвілін». Ток-шоу.
**17.35** «Лёс чалавека». (12+).
**18.45** «Андрэй Малахаў. Прамы эфір». (16+).
**22.10, 23.10 Серыял «Прынада для анёла». (12+).**
**0.15** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.10, 7.10** «Дзелавая раніца НТБ». (12+).
**8.05 Серыял «Злачынства будзе раскрыта». (16+).**
**8.55 Серыял «Вяртанне Мухтара». (16+).**
**9.45, 23.10** «НЗ.by».
**10.20, 19.40** Дзённікі «Удача ў прыдачу!» з «Еўраопт».
**10.25 Серыял «Ляснік». (16+).**
**12.05** «Суд прысяжных». (16+).
**13.25, 18.25** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.05** «Месца сустрэчы». (16+).
**16.35 Серыял «ППС». (16+).**
**17.25 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў». (16+).**
**19.45 Серыял «Неўскі». (16+).**
**21.20 Серыял «Справа гонару». (16+).**
**23.30** «Вынікі дня».
**0.00 Серыял «Агенцтва схаваных камер». (16+).**

### 8 канал

**7.00, 15.55, 19.40, 21.00, 23.55** «Надвор'е».
**7.05** «Сябры дзядулі Марка».
**7.30** Раніца на восьмым.
**10.30** «Адшукваецца адпачынак».
**11.00 Камедыя «Афоня» (12+).**
**12.40, 18.35, 19.25, 20.45** «Дома ТБ» прадстаўляе».
**13.00** «Самы добры дзень».
**16.05** «Мультпарад».
**16.15 Серыял «Дарагі доктар» (12+).**
**17.40 Серыял «Выратаваць боса» (12+).**
**18.55** «Мой любімы гадаванец».
**19.45 Серыял «Дама пад вуаллю» (16+).**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05 Камедыя «На пляжы». (12+).**
**23.10 Серыял «Затрымка ў развіцці».**

### ВТБ

**6.00, 15.15** Серыял «Вароніны». (12+).
**7.20** «Дурні і дарогі». (16+).
**7.40, 4.20** М/ф «Смяшарыкі». (0+)
**8.10, 4.40** М/ф «Фіксікі». (0+)
**8.25, 4.55** М/ф «Чычылэнд». (0+)
**8.40, 3.50** «Ералаш». (6+)
**9.30, 19.00** Серыял «Маладзёжка-5». (12+).
**10.40** Камедыя «Мы — легенды». (12+).
**12.40, 5.10** Скетч-шоу «6 кадраў» (16+).
**13.00** «Паспець за 24 гадзіны». (16+).
**14.10, 20.10** Серыял «Два бацькі і два сыны». (16+).
**16.45** Серыял «Прынц Сібіры». (16+).
**17.50, 23.30** «Уральскія пельмені». (16+).
**21.20** Камедыя «Джунглі клічуць! У пошуках Марсупіламі» (12+).
**0.00** Серыял «Гульня». (16+).
**0.50** Серыял «Бязмоўны сведка». (16+).
**1.50** Серыял «Закрытая школа». (16+).
**3.30** «Лаві момант». (16+).

### Культура

**6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 10.00, 15.00, 19.30, 0.00** Навіны культуры.
**6.35** Хто ў доме гаспадар.
**7.05** «Легенды сусветнага кіно». Сяргей Бандарчук.
**7.35** «Падарожжы натураліста».
**8.05, 21.10** «Правілы жыцця».
**8.35, 22.20** «Абацтва Даўнтан». Маст. фільм.
**9.25, 23.10** Сусветныя скарбы.
**9.40** Галоўная роля.
**10.15, 18.30** «Назіральнік».
**11.10, 0.55** ХХ стагоддзе. «Тэатральныя сустрэчы. Андрэй Міронаў і Яўгенія Сіманава». 1980 г.
**12.15** «Геній».
**12.45** «Дэвід Лівінгстан». Дак. фільм.
**12.55** Штучны адбор.
**13.35, 20.05** «Свет Стоўнхенджа». Дак. фільм.
**14.30** «Рэтгайм, або Разарваны час». «Пінега».
**15.10, 1.55** «П. І. Чайкоўскі і А. С. Пушкін. "Што наша жыццё..."» Дак. фільм.
**16.00** Колер часу. Анры Маціс.
**16.15** «Пешшу...» Растоў Вялікі.
**16.40** «Блізкае кола Стаса Наміна».
**17.35** «Герард Меркатар». Дак. фільм.
**17.45** «Больш, чым каханне». Іван Пераверзеў і Вольга Салаўёва.
**19.45** Галоўная роля.
**20.55** «Добрай ночы, малыя!»
**21.40** «Абсалютны слых».
**23.30** «У цярновым вянку рэвалюцый». «Кастрычнік».
**0.15** «Я мясцовы. Яўген Грышкавец (Кемерава)». Дак. фільм.
**2.45** Колер часу. Жан Агюст Дамінік Энгр.

### Настальгія

**6.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Тэлебачанне Перабудовы: праграма «Погляд». 2006 год (16+).
**7.10** Дак. фільм «Эканоміка ў пошуках ісціны» (12+).
**7.40** Маст. фільм «Мера стрымання» (16+).
**9.00, 15.00, 21.00** «Мінулы час» (12+).
**9.40, 11.00, 14.15, 15.40, 17.00, 17.40, 20.15, 21.40, 23.00, 2.15** Музычная настальгія (12+).
**10.00, 16.00, 22.00** «Народжаныя ў СССР» (12+).
**11.25** Праграма «Чалавек і закон». 1987 год (16+).
**11.55** Праграма «Тэма» з Уладзіславам Лісцьевым: «Па абодва бакі закона». 1992 год (16+).
**12.40** Маст. фільм «Начныя забавы» (16+).
**17.20** «Час пік» з Андрэем Разбашам. 1995 год (12+).
**18.00** «Спяем, сябры!» з Таццянай Візбар. 2007 год (12+).
**19.05** Маст. фільм «Камічны палюбоўнік, або Любоўныя задумы сэра Джона Фальстафа» (12+).
**23.20** Дак. фільм «Зоркі савецкага спорту» (12+).
**0.00** «Замежная эстрада». 1988 год (12+).
**1.20** «У гасцях у М. Магамаева». Элвіс Прэслі. 1991 год (12+).
**3.00** Маст. фільм «Чарадзеі» (12+).
**5.25** Серыял «33 квадратныя метры. Дачныя гісторыі» (16+).

### EuroSport 1

**3.00, 1.30** Скачкі з трампліна. Летні Гран-пры.
**4.00, 9.45, 14.00, 20.00** Снукер. European Masters.
**6.00** Веласпорт. «Еўраметраполь».
**7.00, 11.30, 18.00, 0.00** Веласпорт. Кубак Італіі.
**8.00, 2.30** Супербайк. Этап чэмпіянату свету.
**9.30** Аўтаспорт. Серыя WTCC.
**12.30** «Дух парусная спорту».
**13.00, 19.00** Футбол. Чэмпіянат MLS.

### Кінакамедыя

**0.15** Камедыя «Суперменеджар, або Матыка лёсу». (16+).
**1.45** Камедыя «Лорд Дракон». (12+).
**3.35** «Шоу Камедыянты». (16+).
**4.10** Камедыя «Навіны з планеты Марс». (16+).
**5.55** Камедыя «Фартуна Вегаса». (16+).
**7.30** Камедыя «Парыж любой цаной». (16+).
**9.10** Камедыя «Скандынаўскі фарсаж». (16+).
**10.50** Меладрама «Нашы палюбоўнікі». (18+).
**12.25** Камедыя «Пад маскай жыгала». (16+).
**14.00, 14.50, 15.35** Скетчкам «Паміж намі». (16+).
**14.25, 15.10** «Шоу Камедыянты». (16+).
**16.00** Меладрама «Як выйсці замуж за мільянера». (12+).
**17.45** Камедыя «Навагодняя жонка». (16+).
**19.30** Камедыя «Трымай удар, дзетка». (12+).
**21.20** Камедыя «Ну ты і прыдурак!» (16+).
**23.00** Камедыя «Піўная ліга». (16+).

### ТБ3

**6.00** М/ф (6+).
**8.25** «Доктар І...» (16+).
**8.55, 19.05, 3.10** «Каралёк — птушачка пявучая». Серыял (16+).
**10.35, 4.45** «Судовыя страсці». Дак. серыял (16+).
**12.15** «Сляпая» (12+).
**13.15** «Варажбітка» (12+).
**14.15, 4.45** «Паралельны свет» (12+).
**15.10** «Трэндзі» (16+).
**15.40** «Здзелка» (16+).
**16.10** «Натуральны адбор» (12+).
**17.05** «Адкрыта» (12+).
**18.00** «Другое дыханне». Серыял (16+).
**20.55** «Магазіна» (16+).
**21.55** «Рэвізора» (16+).
**23.00, 5.35** «Лінія абароны» (16+).
**23.30** «Легенда пра Шукальніка». Серыял (16+).
**0.15** «Тры дні на ўцёкі». Маст. фільм (16+).
**2.20** «Гучныя справы» (16+).

### ТБ1000

**6.10, 17.50** Тупы і яшчэ тупейшы (16+).
**8.25** Не здавайся (16+).
**10.30** Матрыца (16+).
**13.20** Барвовыя рэкі (16+).
**15.35** Апантанасць (16+).
**20.10** Пабочны эфект (16+).
**22.20** Сенсацыя (16+).
**0.10** Пераправа (16+).
**2.30** Цэлаахоўнік (18+).
**4.20** Вясельныя пярэпалах (12+).

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Бармен. (16+).
**8.15** Дуэлянт. (16+).
**10.30** Аднойчы. (16+).
**12.30** Не баліць галава ў дзятла. (6+).
**14.10** Душа шпіёна. (16+).
**16.20, 4.20** Дазвольце цябе пацалаваць... Зноў. (16+).
**18.30** Хатабыч. (16+).
**20.20** Кандагар. (16+).
**22.20** Даўн Хаус. (16+).
**0.00** Навагодні рэйс. 1-я серыя. (12+).
**2.05** Брэсцкая крэпасць. (16+).

### National Geographic

**6.00** Папулярная навука. (12+).
**6.50, 17.15, 20.15, 5.10** Гульні розуму. (12+).
**7.35, 22.30** Зрабі або памры. (12+).
**8.00, 21.45** #тыдзенькосмасу. Місія: Плутон. (12+).
**8.45** Міжнародны аэрапорт Дубай. (12+).
**9.30, 14.05, 5.35** Навуковыя недарэчнасці. (12+).
**10.15, 14.50** #тыдзенькосмасу. Камета стагоддзя. (6+).
**11.00** Шаша праз пекла. (12+).
**11.45** Аўта-SOS. (12+).
**12.30, 15.35** #тыдзенькосмасу: Марс. (12+).
**18.00, 21.00, 0.50, 4.20** Дзікі тунец. (12+).
**18.45** Зорная размова. (16+).
**19.30, 0.05** Расследаванні авіякатастроф. (12+).
**22.55** Код небяспекі. (12+).
**23.20, 3.30** Уварванне на Зямлю. (16+).
**1.35** Дзіяна: страчаныя кадры. (12+).

### Discovery

**8.00, 17.00, 22.00, 4.40** Махінатары. (12+).
**9.00, 15.30, 21.30, 6.45** Як гэта ўстроена? (12+).
**9.30, 15.00, 21.00,6.20** Харчовая фабрыка. (6+).
**10.00, 16.00, 23.00, 3.50** Танкі. (12+).
**10.30, 16.30, 23.30, 4.15** Склады: бітва ў Канадзе. (12+).
**11.00** Брудныя грошы. (12+).
**14.00** Аляска: сям'я з лесу. (16+).
**18.00** Хуткія і гучныя. (12+).
**19.00** Залатая ліхаманка. (16+).
**20.00** Голыя і напалоханыя XL. (16+).
**0.00** Узрываючы гісторыю. (6+).
**1.00, 7.10** Вулічныя гонкі. (16+).
**2.00** Самагоншчыкі. (18+).
**2.55** Мадэль для зборкі. (16+).
**5.30** Маланкавыя катастрофы. (16+).

## Усходні гараскоп на



**АВЕН.** Надыходзіць час для самаўдасканалення, вы самі адчуеце, што трэба нешта мяняць. У гэты перыяд вашы недахопы будуць асабліва кідацца ў вочы, аднак паспрабуйце не рэагаваць на крытыку ў свой адрас занадта балесна. Так вы наблізіцеся да дасканаласці яшчэ на пару прыступак. Паспрабуйце засцерагчы сябе ад лішніх і непатрэбных кантактаў на працы. Не зашкодзіць пабольш засяроджанасці на справах.



**ЦЯЛЕЦ.** Надыходзіць няпросты тыдзень, бо назбіралася шмат спраў, якія лепш перарабіць не адкладаючы. У пачатку тыдня канкурэнты ці калегі могуць выставіць вас у нявыгадным святле. Аднак вы здольныя хутка аднавіць свой аўтарытэт. Могуць пераследаваць некаторыя нявязкі ў справах, але ў сярэдзіне тыдня ўсе абставіны зменяцца ў лепшы бок. У пятніцу інтуіцыя падкажа правільнае рашэнне ў сітуацыі, якая склалася.



**БЛІЗНЯТЫ.** На гэтым тыдні ў галаву прыйдзе нямала добрых ідэй. І вы будзеце проста ўзорам ветлівасці і цярпення. Лішнія справы рашуча адкідайце, гэта вельмі спатрэбіцца ў асабістым жыцці і на працы ў адносінах з калегамі. У аўторак пастаўцеся да новых кантактаў і знаёмстваў больш уважліва, у гэты дзень ёсць шанц сустрэць па-сапраўднаму родную душу. У суботу варта разабрацца са старымі рэчамі і пачуццямі і выкінуць хлам не толькі з хаты, але і з галавы.



**РАК.** На гэтым тыдні, калі вы не падарожнічаеце ці не адпачываеце, можа наступіць час вялікай актыўнасці ў партнёрскіх адносінах. Наўрад ці атрымаецца пабыць у адзіноце, нават калі вы гэтага вельмі захочаце. Пачатак тыдня можа быць спрыяльным для вучобы і працы. Вялікая імавернасць знайсці годных саюзнікаў у рэалізацыі вашага практычна геніяльнага праекта. У выхадныя будзьце падобныя да вулкана, паспрабуйце кантраляваць свае эмоцыі.



**ЛЕЎ.** Будзе цяжкавата зразумець, у чым вы не мелі рацыі. Аднак усё ж прыслухайцеся да заўваг, якія зробяць блізкія людзі. Яны не жадаюць вам зла. Спрыяльныя кантакты з калегамі здалёку, магчымыя паездкі, камандзіроўкі або візіт да старых сяброў. Ёсць магчымасць узнікнення складанасцяў у адносінах у сям'і, дзеці могуць павесці сябе зусім не так, як вы чакаеце. Праявіце такт і цярпенне.



**ДЗЕВА.** Выкарыстайце гэты тыдзень для атрымання інфармацыі. Наведайце лекцыі і майстар-класы. Пабольш упэўненасці ва ўласных сілах, і, што вельмі важна, захоўвайце эмацыянальную раўнавагу, але пры гэтым больш давярайце інтуіцыі. Ініцыятыўнасць, якая спалучаецца з тонкай дыпламатыяй, дазволіць найлепшым чынам уладзіць любыя непаразуменні з дзелавымі партнёрамі. Серада парадуе цікавымі навінамі і канструктыўнымі прапановамі ад начальства. Пятніца схіляе да абмеркавання з сябрамі ўзніклі праблемы. Яны дапамогуць мудрай парадай або рашучымі дзеяннямі.

■ Простая мова

# НАДЗЕЯ НЕ ПАМІРАЕ...

**Кажуць, што прыгожа адзетая жанчына, прыгожая і раздзетая. А тым больш калі ў яе стройная фігура, загар... Мусіць, з поўдня прыехала?**

**— Так, спярша на Азоўскім моры пагрэлася, — нібы чытаючы думкі хваліцца тая (і, вядома ж, не мне, — сваёй прыяцельцы), — а потым яшчэ і на Чорным. А ты свой водпуск дзе правяла?**

**— Таксама на моры: мы з мужам рамонт зрабілі, працы — ну проста мора было.**

**...І ці толькі ў іх?**

## «Нам не дано предугадать...»

Крамка была як крамка, і вітрына як вітрына: позіркам лёгка знайшлі патрэбнае, прыкінулі, колькі ўзяць: заставалася хіба «агучыць».

За прадавачкай справа не стала: жанчына тут жа «нырнула» ў халадзільнік, на вагу паклала тавар.

Нам бы глядзець, колькі ж заважыць, прыкідваць, колькі плаціць, але не: за спінай у прадавачкі нейкі плакат — прычым вершаваны, грэх не прачытаць:

*Не зли других и сам не злись,*
*Мы ж гости в этом бренном мире.*
*И если что не так — смирись!*
*Будь поумнее, улыбнись...*

Пакуль чыталі гэтыя радкі, прадавачка не проста ўзважвала наш тавар, яна... абважвала: не нашмат (з-за такой драбязы спрачацца не пойдзеш), але ж...

Нітка да ніткі, як той казаў, — беднаму сарочка.

Разабрацца б яшчэ, хто сёння бедны?

## Каб на хмель не мароз...

Хату для Кандрата прыгледзеў брат — выпадкова. Ён жа і старгаваўся, можна сказаць: Кандрату заставалася толькі грошы аддаць, аформіць куплю. Ну чаму б і не? Лецішча ім патрэбна? Патрэбна (унучак «на асфальце» расце). Месца файнае? Файнае. Сад са студняй. Галоўнае, танна... Бабуля, праўда, побач круцілася, прычым дзіўная: крадком падыходзіла, божкала: «Людцы, куды вы лезеце?»...

Ім бы прыслухацца, распытаць яе, дык жа не — падумалі, што старая проста шкадуе іх: маўляў, хлявы благія, зямля запушчаная, працы мала...

Але ж яе ды ўсёй сям'ёй яны б неяк агаралі. З іншым не справіцца: з двара з першых дзён стаў знікаць рыштунак, з гарода — ураджай, а ў хаце неяк... заспелі чужых.

Аказалася, адзін з суседзяў амаль 15 гадоў (з невялікімі перапынкамі) жыў у месцах зняволення. І таму цяпер, хоць забі, не разумеў, чаму нельга ўзяць сякеру, калі ёй нікто не сячэ (потым можна вярнуць), чаму нельга з'есці ягады, калі яны паспелі, і чаму ў пустой хаце нельга пажыць яго сябрукам, якія днямі выйшлі на свабоду...

Карацей, не прыйшлася хата Кандрату.

І не прадасі.

## Шыла на мыла?

Максіму ў яго 22 бывала блага (прычым не раз), але ж каб гэтак...

Тры гады як вол працаваў, свету, можна сказаць, не бачыў, але купіў машыну, прычым не нейкі «карчвdefinitelyаген», а новенькі чорны «бумер». Пра яго яшчэ песня была, — Макс нават словы ведаў, спяваў...

І вось ужо сам птушкай ляцеў па горадзе, з форсам пазіраў на дзяўчат, ліха тармазіў ля гандлёвага цэнтра, але ж... няўдала: метра за паўтара ад адной машыны, столькі ж — ад другой. Трэцяй (з трыма «качка́мі»), выходзіла, і стаць няма дзе?

— Э, вадзіла, карыта сваё пасунь! — загадалі яны Максіму.

...Вечарам ён напіўся.

— Я ж тры гады, — жаліўся дзеду, — ішачыў, тры гады, можна сказаць, на ліверцы сядзеў. А яны — «карыта»...

На мой «бумер»... Я ж сябе чалавекам на ім адчуў, дзевак пакатаць збіраўся, людзей здзівіць...

— Сёння? Бумерам? — перапытаў яго дзед. — Дохлы нумар. Ты лепш «Запарожца» майго вазьмі. Сорак гадоў «вушастаму», а носіцца, як тады... Дзеўкі на яго, можа, і не клюнуць, а розныя «качкі» — зуб даю — дарогу саступяць...

## Пайсці... І не вярнуцца?

Выходзячы замуж за артыста — маладога, прыгожага і таленавітага, дзяўчына, відаць, разумела, што на вернасць яго разлічваць цяжка...

Так яно і атрымалася: даходзілі чуткі. А неяк і зусім... Муж сам, адкрытым тэкстам, сказаў ёй, што кахае іншую, што сыходзіць. І стаў збіраць чамадан.

Як ні дзіўна, жонка ў гэты час (двое малых было) не крычала, не плакала. Хіба ў апошні момант, калі ён ля парога быў, тулячы дзяцей, сказала:

— Ведай, што мы цябе вельмі любім і будзем чакаць.

Праз тыдзень-другі муж не вытрымаў — вярнуўся дамоў, каб ніколі больш не сыходзіць, не здраджваць сваім, хоць магчымасцяў было — больш чым дастаткова (як акцёр ён здымаўся і як рэжысёр здымаў найярчэйшых зорак айчыннага кіно).

З кім гэта было? З Яўгенам Мацвеевым. Калі? Нядаўна. Ці ўсё ж даўно, бо цяпер (такое ўражанне) так, як ён, ніхто не сыходзіць (б'юцца талеркі, ляцяць масты...) і не вяртаецца. Хоць нехта ж і не дурны казаў, што каханаму чалавеку можна дараваць усё — нават здраду. Гэта некаханым не даруеш нічога, нават недасолены суп.

## Я сама?

Горад. Свята. Пад адкрытым небам, на сцэне — вялікі канцэрт, вакол яе — не менш натоўп. Сесці няма дзе... Дык нават стаць... Добра малечы — на татавых плячах.

— Я таксама хачу... Вазьмі, — капрызіць побач хлопчык гадкоў, можа, трох.

— Але ж я цябе не ўтрымаю, — віnavata кажа матуля.

— А я хачу, хачу! — гледзячы на іншых дзяцей і ўзняўшы ручкі, тупае нагамі малы.

На іх пачынаюць азірацца людзі. І жанчына, цяжка ўздыхнуўшы, бярэ такі малога пад пашкі, падымае на выцягнутых руках і, трошкі патрымаўшы, каб ён таксама пабачыў сцэну, ставіць на зямлю. Не тыя сілы.

Тыя былі б у мужа, у таткі гэтага мальца. Але ж дзе ён? Сабакам сена косіць? Гарэлку п'е? Грошы зарабляе?

Магчыма. І гэта — не горшы варыянт.

## Дзеля каханай

...У снежні ў іх васелле, прычым не простае, а залатое: разам 50 гадочкаў, як адзін дзянёк!

— Мы з Пецем добра жывём, — выхваляецца кабета. — Я за ім як за каменнай сцяной: і шкадуе ён мяне (а я — яго), і клапоціцца, і ніколі ні ў чым не папікне!.. А я ж з маладосці легкадумнай была, надта грошы траціць любіла. Як найболей мне дай, па крамах разнясу. Але Пеця і тады мне слова не сказаў. Зарабляў...

— І, мусіць, добра?

— Ну, менш за тысячу (у савецкіх рублях) ніколі не прыносіў.

Было кабеце што траціць.

## Прагрэс і рэгрэс

Будзень. Крама. Досыць маладыя бадзёрыя гандляры, пажылыя (бо зранку зніжкі для іх), яшчэ сонныя пакупнікі. Вядома ж, не ўсе, іншыя (а дакладней, *іншая*) таксама ёсць.

Гэта жанчына ці не ў госці сабралася: ужо з прычоскай, з макіяжам, у строгім светлым касцюмчыку...

— Мне сем піражкоў, калі ласка. З тварагом, — просіць яна прадавачку. — Толькі знізу вазьміце... Вось тых (паказвае пальцам на прыгожую горку).

— Жанчына, яны ўсе аднолькавыя, свежыя — і знізу, і зверху, — павышаючы голас, пачынае даводзіць прадавачка.

— І ўсё ж... Я прашу...

— А я што — дзеля вас тут усё пабуру? — кідаючы ў пакет піражкі і, дарэчы, нічога не бурачы, апроч... настрою (свайго і чужога, зранку) крычыць прадавачка.

...Некалі, гадуючы малых, у модзе было «падлічваць» пальчыкі, гэта знаходзіць, па чарзе пацiскаючы пазногцікі, расказваць пра сароку-варону, якая кашу варыла, дзетак карміла...

Цяпер ужо іншыя часы: у руکі малым усё часцей даюць мабільнікі — хай самі націскаюць кнопачкі.

Што цікава, у тэлефонах тады спрацоўвае так званая абарона ад дурня, у людзей — чамусьці не?

## На ўсякага ліхача...

Камандзіроўкі бываюць розныя — то ўдалыя, то не вельмі.

Якраз з такой каляжанка вярнулася, інтэрв'ю прывезла. Гутарка як гутарка, а вось за ёй...

У выканкам, як казала, хвілін з дзесяць заходзілі, бо «часавому» на ўваходзе мала было журналісцкіх пасведчанняў (з пячаткамі, з фота), ён папрасіў пашпарты, затым праверыў сумкі (найбольш — у фатографа, з апаратурай).

І далей не лепш: зайшлі ў патрэбны кабінет, загаварылі з гаспадаром — па-беларуску. Той (што цікава — з мясцовых!) строга перапыніў:

— *Я вас плохо понимаю, говорите со мною по-русски.*

«Нам бы сказаць, — перажывала пазней каляжанка, — што і мы яго разумеем дрэнна, бо ён, як прадстаўнік дзяржавы, павінен ведаць абедзве мовы. Да таго ж не адгароджвацца ад людзей аховай. Але... Разгубіліся, не чакалі падобных паводзін. Ды і матэрыял рыхтавалі ў нумар. А таму як бы заплюшчылі вочы на грозны дазор, як бы не пачулі ганарыстага *«не понимаю»*.

...Некалі даўно ў адным з выканкамаў старшынёй працаваў спадар Ліхач, кажуць, досыць моцны быў гаспадарнік, нядрэнны чалавек: як віхор лятаў па сваім раёне — усюды хацеў дапяць.

Дык вось. Ляціць ён неяк па вёсцы з хуткасцю ў сто кіламетраў, — даішнік наперарэз: стойце, маўляў, і плаціце штраф. Той у крык: «Ды хто ты такі і што сабе дазваляеш? Я — Ліхач! Не бачыш ці што?»

— Бачу, што вы ліхач, — спакойна адказаў даішнік. — Штраф заплаціце і едзьце — не парушайце правілы...

Гэта да таго, што на ўсякага ліхача (верыцца яму ці не верыцца) знойдзецца свой даішнік.

Раней ці пазней.

## Надзея не памірае...

У Веры была дачушка — і радасцю, і надзеяй... Аднак спраўдзіцца ёй не выпала: не падумаўшы, рана, збегала замуж — за пітушчага, за нягеглага, прыжыла з ім дзіцятка і развялася...

З часам знайшла сабе іншага (ужо цвярозага) і... знікла з ім аж на два гады. Ні слыху, ні дыху не было: да матулі — ні званка, ні пісьма, ні капейкі... Толькі дзіця, хлопчык.

Але ж неяк яго маці спатрэбіўся новы пашпарт. Прыехалі — удвух са сваім, трохі пагасцілі, пабылі, сталі збірацца назад.

— Можа, хлопчыка возьмеце? — спытала матуля. — Яму ж у школу ісці. Ды і я не жалезная, здароўя няма. Раптам Бог прызаве? Што з дзіцем будзе?

— Ды не бойцеся, — смела запэўніў зяць, — яно не прападзе, яно і ў дзетдоме вырасце.

А дачка зусім прамаўчала.

...Была яна ў маці за радасць і надзею.

Цяпер за іх... унучак.

**Валянціна ДОЎНАР.**
*dounar@zviazda.by*

■ Неасабісты суб'ектыў

# ЧАС І НОРАВЫ



### Ці заўсёды нашы ўчынкі залежаць ад стагоддзя, у якім мы жывём

Трагедыя, што здарылася ў Воранаве, на стужкі крымінальных навін ужо пасунутая ў архіў іншымі паведамленнямі аб надзвычайных здарэннях. Хоць яе нельга назваць «тыповай» ці «звычайнай», — сямнаццацігадовы падлетак падазраецца ў забойстве сваёй саракагадовай маці. Ён, як прызнаўся праваахоўнікам, некалькі разоў ударыў яе самаробным мячом па галаве і схаваў цела ў хмызах. Ісці здавацца не спяшаўся: з моманту забойства мінуў тыдзень, і, калі б не калега няшчаснай ахвяры, што падняла трывогу, невядома, колькі б забітая яшчэ ў тых кустах праляжала.

Пакуль вядзецца следства, высвятляюцца падрабязнасці і матывы гэтага нялюдскага злачынства, само яно на месцы здзяйснення, а асабліва ў сеціве, ужо стала гісторыяй амаль у шэкспіраўскім стылі — з каханнем, страсцю і смерцю. Кажуць, што хлопец забіў маці з-за таго, што яна была супраць, каб ён жыў са сваёй шаснаццацігадовай дзяўчынай. Знайшліся ўжо і сведкі, якія нібыта чулі і бачылі, што непаўналетнія закаханыя хацелі пабрацца шлюбам любой цаной. Нават профіль дзяўчыны ў сацыяльных сетках і той нібыта пра гэта сведчыць: там імя каханага напісана з сардэчкам пасля кожнай літары. Карацей, Рамэа ды Джульета на сучасны лад, толькі фінал не ў той бок закруціўся.

Так яно на самай справе было ці не — следства разбярэцца. Мяне (даруйце за некаторы цынізм) у гэтай гісторыі больш зачапілі каментарыі, — а іх на розных парталах дзясяткі. Вельмі-вельмі рэдка гучыць у іх спачуванне і асуджэнне таго, што адбылося. Больш — філасофска-псіхалагічныя разважанняў пра тое, што бывае, калі «гармоны замяняюць мозг». І ўжо лейтматывам — «О времена! О нравы!» — маўляў, цяпер і час такі, і свет такі, і чаго чакаць ад гэтага пакалення, што на баевіках ды на стралялках вырасла...

І вось тут паслужлівая памяць падсунула іншую гісторыю, абсалютна рэальную і праўдзівую, якая здарылася зусім недалёка ад месца сённяшняй трагедыі — у вёсцы Дунілавічы Пастаўскага раёна восемдзесят з лішнім гадоў назад, у далёкім 1936-м, «за польскім часам». Мне яе калісьці дапамагла «раскруціць» светлай памяці Ніна Маркаўна Захарэвіч з Пастаў: мы тады разам ездзілі ў Дунілавічы, шукалі сведкаў тых падзей, прадзіраліся праз гушчар на старых закінутых могілках...

Нават імёны герояў той даўняй дунілавіцкай трагедыі — Мар'ян і Аліна — дзіўным чынам вельмі сугучныя з тымі, што фігуруюць у справе па забойстве ў Воранаве. Мар'ян быў сынам месцачковага доктара, чалавека паважанага і заможнага, бацькі Аліны былі бедныя. Маладыя сустракаліся-любіліся, справа ішла да вяселля. Але маці Мар'яна бачыла жонкай адзінага сына зусім іншую дзяўчыну і была катэгарычна супраць. Калі аднойчы Мар'ян вярнуўся са спаткання, яна ўчыніла скандал і заявіла, што, пакуль яна жывая, сын з беднячкай не ажэніцца. Хлопец, напэўна, успрыняў гэтыя словы літаральна, а можа, проста ўсё дайшло ўжо да апошняга пункта кіпення. Ён узяў бацькаў рэвальвер і выстраліў у маці. Тая вохнула, схапілася за грудзі і ўпала як падкошаная. Мар'ян, выскачыўшы з хаты, памчаў да каханай, усё яшчэ трымаючы зброю ў руках. Імчаў... забіваць Аліну: разумеў, што за забойства маці пасадзяць надоўга і дзяўчына наўрад ці будзе чакаць. Карацей, «дык не дастаўся ж ты нікому!»

Бабулі, якія памяталі гэтыя страшныя падзеі ў Дунілавічах, расказвалі мне тады, што дзяўчына памерла не адразу: усе сцены ў пакоі, дзе яе забівалі, былі перапэцканыя крывёй. Яе забойца ўцёк і хаваўся ў навакольных лясах, паліцыя ніяк не магла выйсці на яго след. А ён, калі Аліну хавалі, сядзеў на высокай хвоі на ўскрайку могілак і назіраў. І ўбачыў... сваю маці, жывую і здаровую. Ён тады ў яе нават не трапіў, кабета проста самлела ад спалоху... Пачакаўшы, пакуль пойдуць людзі, Мар'ян прыйшоў на магілу Аліны, прыставіў пісталет да скроні, націснуў на курок. У яго руцэ знайшлі запіску: «Аліна хоча белага бэзу»...

Мы тады, дваццаць гадоў назад, знайшлі магілу Аліны Самовіч у закінутай частцы дунілавіцкіх могілак. Захаваўся нават дыхтоўны помнік, пастаўлены ў далёкім 1936-м, але магіла была зусім недагледжаная: у дзяўчыны не было ні братоў, ні сясцёр, на ёй род перапыніўся. Гэтаксама як і род Мар'яна, але ад яго праз гады не засталося нават узгорачка пад крыжам: самазабойцаў у той час хавалі за агароджай, без помнікаў. Іх гісторыя засталася ў песні, якую і сёння ў розных варыяцыях, але з адным сэнсам, спяваюць самадзейныя калектывы ў тых краях. Так што, калі пачуеце на Пастаўшчыне ці ў наваколлі «У панядзелак рана, як сонейка ўзышло, прыйшоў Мар'ян к Аліне, сказаў ён ёй усё. «Аліна дарагая, ты знаеш, што зрабіў — сягоння на світанні матулю я забіў...», — ведайце: гэта ўсё было на самай справе, і Шэкспір тут па трагічнасці і недарэчнасці рэальнага сюжэта сапраўды можа адпачываць...

Я да чаго, уласна, гэтыя дзве трагедыі паміж сабой звязала. Не трэба наракаць на час, а ўжо тым больш яго ва ўсім вінаваціць. Час — ён заўсёды няпросты, незалежна ад стагоддзя, тысячагоддзя, эры. Асабліва калі робіш выбар, што важней: уласныя спакой і шчасце ці спакой і шчасце блізкага чалавека, калі рашаеш, што і як сказаць і зрабіць у адносінах з ім. Не пра кожны наш учынак — высакародны, подлы або проста дурны, але ад гэтага не менш непапраўны — складуць песню ці легенду. Але кожны будзе запісаны на наш асабісты рахунак, па якім абавязкова рана ці позна давядзецца плаціць.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.** *alena@zviazda.by*

## Извещение о проведении торгов по продаже права заключения договора оказания услуг по размещению рекламы на портале авторизации для идентификации абонентов WI-FI сетей

Аукционные торги проводятся **17 октября 2017 г**. в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Организатор торгов – коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10.

| № предмета торгов | Местонахождение WI-FI сетей, осуществляющих идентификацию абонентов через портал авторизации | Вид, количество средства рекламы и иные характеристики | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. в месяц с учетом НДС | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | г. Минск, пл. Привокзальная, 3. Вокзал станции Минск-Пассажирский<br>Витебская область, г. Орша, ул. Заслонова, 3а. Вокзал станции Орша<br>Минская область, г. Молодечно, ул. Вокзальная, 7. Вокзал станции Молодечно<br>Минская область, г. Борисов, ул. Труда, 7а. Вокзал станции Борисов<br>Брестская область, г. Барановичи, ул. Фроленкова, д. 13. Вокзал станции Барановичи-Полесские<br>Гродненская область, г. Лида, ул. Труханова, 12В. Вокзал станции Лида<br>г. Гродно, ул. Буденного, 37. Вокзал станции Гродно<br>Брестская область, г. Лунинец, ул. Вокзальная, д. 6. Вокзал станции Лунинец<br>г. Брест, ул. Кижеватова, 1Б/1. Вокзал станции Брест-Центральный<br>Брестская область, г. Пинск, ул. Железнодорожная, 19. Вокзал станции Пинск<br>г. Гомель, Привокзальная площадь, 3. Вокзал станции Гомель<br>Гомельская область, г. Жлобин, Привокзальная площадь. Вокзал станции Жлобин<br>Гомельская область, г. Калинковичи, ул. Октябрьская, д. 30. Вокзал станции Калинковичи<br>г. Могилев, Привокзальная площадь, 1. Вокзал станции Могилев<br>Могилевская область, г. Осиповичи, ул. Вокзальная, 18. Вокзал станции Осиповичи<br>Могилевская область, г. Бобруйск, ул. Железнодорожная, 13. Вокзал станции Бобруйск<br>Могилевская область, г. Кричев, ул. Пугачева, 6. Вокзал станции Кричев<br>г. Витебск, ул. Космонавтов, 8. Вокзал станции Витебск<br>Витебская область, г. Полоцк, ул. Октябрьская, 44. Вокзал станции Полоцк | Интернет-баннер сверху либо снизу портала авторизации и полноэкранный интернет-баннер.<br>**Интернет-баннер сверху либо снизу портала авторизации (согласно схеме):** длительность показа: постоянно (с возможностью закрытия их пользователем); поддерживаемые форматы: gif, png, jpg, jpeg, flash; размеры: 300×250 пикселей; вид размещения: статический, динамический без аудиосопровождения.<br>**Полноэкранный интернет-баннер (согласно схеме):** длительность показа: 10с.; поддерживаемые форматы: gif, png, jpg, jpeg; размеры: 468×60 пикселей; оптимизация под экран устройства. | 5 376,0 | 537,60 |
| | *Срок, на который заключается договор оказания услуг по размещению рекламы, – **3 года*** | | | |

Документы на участие в торгах принимаются с **02.10.2017 по 13.10.2017** включительно в рабочие дни с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 6.

Документы, поданные по истечении указанного срока, не рассматриваются.

**Порядок оформления участия в торгах:** к участию в аукционных торгах допускаются юридические лица и индивидуальные предприниматели, внесшие задаток (задатки) и заключившие с организатором торгов соглашение установленной формы о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения торгов по соответствующему их предмету (далее – соглашение), а также представившие организатору торгов следующие документы:

– заявление на участие в торгах;

– копию свидетельства о государственной регистрации организации или индивидуального предпринимателя;

– копию устава организации (учредительного договора – для коммерческой организации, действующей только на основании учредительного договора);

– заверенную банком копию платежного документа о внесении суммы задатка на счет организатора торгов.

Сумма задатка должна быть внесена не позднее окончания срока и времени, установленных для приема документов, на расчетный счет организатора торгов №BY34BPSB30121049710199330000 в Региональной Дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк» по г. Минску и Минской области, БИК BPSBBY2X, 220035, г. Минск, пр. Машерова, д. 80, УНП 190398583 **(назначение платежа – задаток для участия в аукционных торгах от 17.10.2017 по предмету торгов №1).**

Лицо, подающее документы на участие в торгах, предъявляет документ, удостоверяющий личность. Представитель индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет организатору торгов оригинал документа, подтверждающего его полномочия, и документ, удостоверяющий личность.

*Ответственность за достоверность сведений, указанных в документах, представленных для участия в торгах, несут лица, их подавшие.*

Лицу, допущенному к участию в аукционных торгах, организатор торгов выдает билет участника торгов, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано.

**Порядок определения победителя торгов:** торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов. Если заявление на участие в торгах подано только одним участником, предмет торгов продается участнику, подавшему единственное заявление на участие в торгах по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Иные условия торгов:**

Победитель торгов (приравненное к нему лицо) **в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов** обязан возместить государственному предприятию «МГЦН» затраты на организацию и проведение торгов, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для их проведения.

Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом торгов под подпись.

Цена продажи предмета торгов за вычетом внесенной суммы задатка **в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов** перечисляется победителем торгов (приравненным к нему лицом) на текущий (расчетный) счет УП «Минское отделение Белорусской железной дороги».

*Цена продажи предмета торгов за вычетом внесенной суммы задатка учитывается в счет оплаты за первый месяц оказания рекламных услуг по договору.*

Договор оказания услуг по размещению рекламы между победителем торгов (приравненным к нему лицом) и УП «Минское отделение Белорусской железной дороги» заключается **в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов**, при условии внесения платы за предмет торгов и возмещения организатору торгов расходов на их организацию и проведение.

**Размер штрафа, уплачиваемого участником торгов и (или) его победителем (приравненным к нему лицом), в случаях, предусмотренных законодательством и соглашением, составляет 100 (сто) базовых величин на дату проведения торгов.**

Телефон для справок: отдел аукционов – (017) 327-40-22, отдел по управлению государственным имуществом УП «Минское отделение Белорусской железной дороги» – (017) 255-31-93, (017) 255-31-91. Сайт в сети интернет: www.mgcn.by.

## ОБЪЯВЛЕНИЕ о повторных торгах

Отдел принудительного исполнения Оршанского района и г. Орши объявляет о проведении повторных торгов по продаже имущества, принадлежащего СООО «Нафта-Сервис».

Номер лота, вид выставляемого на торги имущества: Лот №1, объект для хранения нефтепродуктов.

Наименование, начальная цена, место нахождения: емкость металлическая с лестницей для хранения нефтепродуктов в количестве 1 шт., начальная цена – 4696,80 рубля, место нахождение – г. Орша, ул. Южная, 83.

Имеющиеся обременения в отношении имущества – без обременений.

Место, дата и время проведения торгов: г. Орша, ул. А. Островского, 36, каб. 1; 19 октября 2017 г. в 11.00.

Справочная информация: Маханькова Анастасия Александровна, заведующая сектором, тел.: 8 (0216) 543212, 8 (033) 6161412, отдел принудительного исполнения Оршанского района и г. Орши, адрес: ул. А. Островского, 36, г. Орша, адрес электронной почты opi_orsha@tut.by.

Задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (лота) должен быть зачислен в срок до 16 октября 2017 г. на депозитный счет отдела принудительного исполнения Оршанского района и г. Орши №BY22AKBB36429030007942200000, УНН 300002505, филиал №215 ОАО «АСБ «Беларусбанк» г. Орша, код AKBBBY21215.

Величина первого шага составляет 5 процентов начальной стоимости выставленного на торги имущества (лота).

В соответствии со статьей 97 Закона Республики Беларусь «Об исполнительном производстве» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги (покупателем).

## Извещение о проведении торгов

**Организатор торгов:** Антикризисный управляющий ИП Шибук Ирина Адамовна, почтовые реквизиты: 220108, г. Минск, а/я 122, тел./велком: +375 29 126-05-91, +375 29 666-71-75, e-mail: antikrizis2015@tut.by

**Продавец:** Закрытое акционерное общество «Мастерподшипник», почтовые реквизиты: 220108, г. Минск, а/я 122, тел./велком: +375 29 126-05-91, +375 29 666-71-75, e-mail: antikrizis2015@tut.by

**Форма, дата, время и место проведения торгов. Первые повторные торги** в форме аукциона состоятся **03 ноября 2017 в 09.00 по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 11А, офис А-710.**

**Сведения о предмете торгов, порядок ознакомления с ним: Лот №1:** подшипник роликовый сферический 230/560 К. Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочие дни с 09.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, пер. Стебенева, 9а, предварительно согласовав время по тел. +375 29 666-71-75.

**Начальная цена предмета торгов:** 8 775,00 белорусских рублей без учета НДС.

**Порядок проведения торгов:** Шаг аукциона – 5% начальной цены предмета торгов. Победителем торгов будет объявлено лицо, предложившее наибольшую цену. В случае признания торгов несостоявшимися продажа предмета торгов единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах, либо единственному участнику, явившемуся для участия в них, при его согласии осуществляется по начальной цене, увеличенной на 5%. Результаты торгов оформляются протоколом, который подписывается комиссией и победителем торгов в день проведения торгов. Договор купли-продажи подписывается в течение 10 дней с даты подписания протокола. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения в любое время, но не позднее чем за 5 рабочих дней до наступления даты их проведения.

**Размер, порядок и сроки внесения задатка:** Задаток в размере 10% от стоимости предмета торгов зачисляется до подачи заявления на расчетный счет продавца (УНП 800006584, р/с BY35MTBK30120001093300061036 в ЗАО «МТБанк», адрес банка: г. Минск, ул. Толстого, д. 10, код (БИК) MTBKBY22).

**Место, дата и время приема заявлений на участие в торгах и прилагаемых к ним документов:** Заявление на участие в аукционе направляется в срок до 16.00 02.11.2017 по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 11А, офис А-710. К заявлению прилагаются: платежный документ с отметкой банка о внесении задатка, копии документов, подтверждающих юр. полномочия участников торгов: для юр. лиц – копии св-ва о госрегистрации, устав, для ИП – заверенная копия св-ва о госрегистрации, для физ. лица – копия паспорта.

**Возмещение затрат:** Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона производится победителем аукциона по фактическим затратам (расходы на проведение аукциона; расходы на проведение оценки имущества, выставленного на торги; расходы).

**Обременение:** отсутствует.

**Порядок уплаты цены предмета торгов победителем торгов и отгрузка предмета торгов:** Победитель торгов после подписания договора купли-продажи в течение 10 дней производит оплату. С даты поступления оплаты отгрузка предмета торгов осуществляется по адресу: г. Минск, пер. Стебенева, 9а, путем самовывоза

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельоблстрой» (продавец) извещает о проведении 31 октября 2017 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20%), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20%), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| | Местонахождение лотов №№ 1–10: **г. Гомель, ул. Борисенко, 8** | | |
| 1 | **Автомобиль MAZ 256270**, инв. №5470, 2008 г. в., **рег. № АВ 8615-3**, 27 посадочных мест, цвет – белый, кузов Y3M25627080001222, тип ТС – автобус, состояние – удовлетворительное | **33 600,00** | 1 680,00 |
| 2 | **Бульдозер Б10М.0111ЕИ,** категория «С», **рег. №ЕВ-3 1513,** инв. №24700678, зав. №42411 (шасси: марка Т10М 0111, зав. №162732) на гусеничном ходу, 2008 г. в., состояние – удовлетворительное | **48 840,00** | 2 442,00 |
| 3 | **Каток вибрационный категория «Е» Амкодор 6712 В, рег. №ЕК-3 2024**, инв. №24700745, зав. №04100041 (двигатель Д-245-1037, №514543), 2010 г. в., состояние – удовлетворительное | **42 120,00** | 2 106,00 |
| 4 | **Каток вибрационный категория «Е» Амкодор 6622 А**, **рег. №ЕВ-3 2671**, инв. №24700616, зав. №0409031 (двигатель Д-243-708, №495125), 2009 г. в., состояние – удовлетворительное | **42 120,00** | 2 106,00 |
| 5 | **Автомобиль MAZ 256170**, инв. №24700690, 2009 г. в., **рег. №АЕ 2431-3**, 24 посадочных мест, тип ТС – автобус, состояние – удовлетворительное | **39 720,00** | 1 986,00 |
| 6 | **Шасси погрузочное многофункциональное Амкодор 332С4, рег. № ЕВ-3 0624**, инв. №892, зав. №105080404 (двигатель: марка Д260 2, зав. №068612) 2008 г. в., состояние – удовлетворительное | **27 600,00** | 1 380,00 |
| 7 | **Автомобиль MAZ 5551 А2-323**, инв. №5019, 2009 г. в., **рег. №АЕ 2412-3**, кузов (рама) Y3M5551A290001858, тип ТС – грузовой самосвал, допустимая максимальная масса –18 200 кг, состояние – удовлетворительное | **20 760,00** | 1 038,00 |
| 8 | **Автомобиль MAZ 555102 223**, инв. №5477, 2009 г. в., **рег. №АЕ 1927-3**, кузов (рама) Y3M55510290013261, тип ТС – грузовой самосвал, допустимая максимальная масса – 19 200 кг, состояние – удовлетворительное | **15 480,00** | 774,00 |
| 9 | **Автомобиль MAZ 5337 А2**, **КС 55727**, инв. №5021, 2009 г. в., **рег. №АЕ 3372-3**, кузов (рама) Y3M55727790001134 (Y3M6303A390001103), тип ТС – грузовой специальный автокран, состояние – удовлетворительное | **51 960,00** | 2 598,00 |
| 10 | **Автомобиль MAZ 5337 А2**, **КС 45729А4**, инв. №5022, 2009 г. в., **рег. №АЕ 3362-3**, кузов (рама) Y3M4572A490000355 (Y3M5337A290002105), тип ТС – грузовой специальный кран, состояние – удовлетворительное | **35 520,00** | 1 776,00 |
| 11 | **Автомобиль MAZ 6303 А3**, **КС 55727-7**, инв. №00073, 2008 г. в., **рег. №АВ 6530-3**, кузов (рама) Y3M6303A380000569 (Y3M55727780000866), тип ТС – грузовой специальный автокран, состояние – удовлетворительное. Местонахождение: **г. Жлобин, ул. Ленинградская, 7** | **47 520,00** | 2 376,00 |

**Продавец:** ОАО «Гомельоблстрой, г. Гомель, ул. Малайчука,12, конт. тел.: 8 (044) 769-19-61, 8 (0232) 58-43-11 – Яроцкая Людмила Николаевна. **Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона. Для участия в аукционе необходимо: 1)** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга»):** р/с BY34BAPB30122093700130000000, БИК BAPBBY23912, Филиал ОАО «Белагропромбанк» ГОУ, УНП 400071204,ОКПО 285728963000, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления); **2)** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 29 сентября 2017 г**. по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 27 октября 2017 г. в 16.00 включительно. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за три дня до его проведения.** В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) %. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором** торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи **в течение 5 (пяти) календарных дней** и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с «Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 №16 (в ред. постановления Совмина от 12.07.2013 №607). **Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8(029) 126-66-62. Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы».**

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельоблстрой» (продавец) извещает о проведении 11 октября 2017 года открытого повторного аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20%), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20%), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | **Полуприцеп РМТ-20, 2010 г. в., рег. №2921 АА-3**, инв. №967, тип ТС – полуприцеп специальный цистерна (цементовоз), г/п – 22т, количество осей – 2, самозагрузка, состояние хорошее. Место нахождения: **г. Жлобин, ул. Ленинградская, 7** | **13 026,00** | 651,30 |
| 2 | **Экскаватор-погрузчик LiuGong CLG 766, 2008 г. в., рег. №ЕА 2067**, зав. №D00086, инв. №6464, тип ТС – экскаватор-погрузчик колесный, объем ковша 1,0 м. куб, общий вес – 8 000 кг, технически не исправен, состояние условно-пригодное. Место нахождения: **г. Гомель, ул. Борисеко, 8** | **20 520,00** | 1 026,00 |
| | **Местонахождение:** Добрушский р-н, г. Добруш, ул. Полевая, 4. Информация о земельном участке: лоты №№3, 4, 5 расположены на земельном участке с кадастровым номером **321250100003000066** площадью **4,9333 га (право постоянного пользования). В стоимость лотов №3, 4, 5 входят расходы, связанные с созданием земельного участка под обслуживание указанных лотов** | | |
